Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. • 3 — 2 р. — к. • 6 — 4 р. — к. • 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя—20 к. мясцовыя —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнны на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 • Бесарачэўн. і чырвонармейцы за дакумант . . . 15 • За кожны дадатковы . . 5 • Публіка... ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

Г-ны ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 220 (2112) Серада, 28-га верасьня 1927 г.

Ашчаднасьць—на індустрыялізацыю.

Некалькі месяцаў таму назад Старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў зьвярнуўся да працоўных мас Беларусі з заклікам павялічваць свае ўклады ў касы ашчаднасьці. Касы ашчаднасьці дапамагаюць кожнаму рабочаму і селяніну мэтазгодна выкарыстоўваць свае невялічкія ашчаднасьці і адначасова дазваляюць пралетарскай дзяржаве за пэўную ўплату (процантамі) карыстацца гэтымі грашыма, пакуль яны ня будуць патрэбны ўкладчыку. «Навошта нам прасіць грошы ў капіталістаў, калі мы іх можам атрымаць унутры дзяржавы».

Дзяржаўныя пазыкі таксама зьяўляюцца відам ашчаднасьці, калі дзяржава пазычае за процанты ўнутры краіны грошы, а той, хто гэтую пазыку дае (купляючы аблігацыю гэтае пазыкі) будучы ўпэўненым, што яго грошы ўцэлясьці, атрымлівае ад дзяржавы пэўную ўзнагароду за гэтую пазыку. Асаблівае значэньне набывае **пазыка індустрыялізацыі**, якая зараз выпушчана. Для таго, каб даць працоўным масам дабраякасны і танны тавар, нам трэба перабудаваць існуючыя фабрыкі і заводы і пабудаваць цалы шэраг новых буйных прадпрыёмстваў, якія па сваёй канструкцыі будуць адпавядаць найлепшым заграніччным фабрыкам.

Дняпрэстрой, Асінастрой, Сьвірстрой і шэраг іншых электрычных станцый, якія мы пачалі будаваць, па нізкай цане дадуць нашым фабрыкам і заводам апал, рухавую энэргію, чым у значнай меры будзе паніжаны сабекошт прадукцыі. Новыя мэталюргічныя заводы дадуць добры і танны мэталь. Растоўскі завод сельска-гаспадарчых машын дасьць танную машыну селяніну, тэкстыльныя фабрыкі, вугольныя капальні і інш. дадуць добры і танны прадукт спажыўцу. Задача ўсяго гэтага вялізарнага будаўніцтва можа быць вырашана толькі пры ўмове, калі дзяржава атрымае ад насельніцтва ў выглядзе пазыкі тыя 200.000.000 р., якія прадугледжаны пазыкай індустрыялізацыі.

Асноўнае ў гэтае пазыцы індустрыялізацыі тое, што пакупец не апроч процантаў і выйгрышаў, атрымае значную карысьць ад тых прадуктаў і тавараў, якія па больш таннай цане яму паступяць у выніку мэханізацыі і рацыяналізацыі нашых фабрык і заводаў.

Таму справа распаўсюджаньня пазыкі індустрыялізацыі зьяўляецца справай ня толькі фінансавага ведамства, але таксама ўсіх партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і гаспадарчых органаў, усіх рабочых і сялян. Гэтаксама як у індустрыялізацыі краіны зацікаўлены ў ее працоўныя масы, таксама распаўсюджаньне пазыкі індустрыялізацыі павінна зьвяцца абавязкам і клопатам усіх рабочых і сялян нашае рэспублікі.

У гэтай справе савецкая грамадзкасьць, члены гарадзкіх і сельскіх саветаў, члены заводзкіх камітэтаў і ячэйкомаў павінны разгарнуць асаблівую працу ў напрамку павялічэньня **калектыўнае падпіскі**, якая вызваляе падпішчыкаў ад усіх клопатаў, зьвязаных з афармленьнем падпіскі, атрыманьнем аблігацый, ўзносамі і г. д.

Апрача таго, калектыўныя падпішчыкі атрымліваюць упаўне рэальныя выгады: для іх прадоўжваецца тэрміны раскладкі (да 7 месяцаў замест 4), яны пасьля другога узноса поўнасьцю атрымліваюць процанты за ўсю аблігацыю і ўдзельнічаюць у выйгрышах, у той час, як індывідуальным падпішчыкам гэтае права даецца толькі пасьля трэцяга ўзносу.

Нашым лёзунгам павінна быць: **«кожны новы рубель у пазыку індустрыялізацыі дасьць новыя машыны на фабрыках, дасьць новыя тавары. Дайце грошы ў пазыку толькі дзяржаве,—гэта надзейна, выгадна і ўзмацняе Рэспубліку Саветаў».**

Працоўныя Францыі пасылаюць 2 дэлегацыю ў СССР.

Адозва к-ту па сьвяткаваньні 10-х угодак Кастрычніка.

ПАРЫЖ, 26-9. У «Юманітэ» зьмешчана адозва камітэту па арганізацыі сьвяткаваньня 10-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі. У адозве зазначана: «Напярэдадні 10-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі капіталістычныя дзяржавы актыўна рыхтуюцца да ўзброенага наскоку на дзяржаву рабочых і сялян. У Францыі рэакцыйныя газэты перапоўнены пагрозамі і наклёпамі па адрасе СССР і адкрыта ўзьнімаюць пытаньне аб разрыве зносін.

Працоўныя разумеюць вялічэзнае значэньне Кастрычнікавае рэвалюцыі і дадуць рашучы адпор кожнаму ўзброенаму выступленьню проці яе. Самы верны спосаб зьнішчыць паклёпы і ману, гэта каб працоўныя ўласнымі вачыма пераканаліся, якое сапраўднае становішча ў СССР. З гэтае прычыны савецкія [redacted] працоўных запрашаюць [redacted] Францыі прыслаць у СССР дэлегацыі. **Шматлікая французская дэлегацыя, шчыльна зьвязаная з працоўнымі масамі, наведаецца ў СССР у зьвязку з 10-мі ўгодкамі Кастрычніка, убачыць усё ўласнымі вачыма і, вярнуўшыся, перакажа працоўным Францыі праўду пра СССР».**

Дэлегацыя аргентынскіх прафсаюзаў у СССР.

НЬЮ-ЁРК, 26-9. Прафсаюзнае аб'яднаньне Аргентыны пасылае дэлегацыю для ўдзелу ў сьвяткаваньні 10-ых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі.

Увага: „Прафсаюзнае аб'яднаньне"—найбольш буйная аргентынская прафсаюзная арганізацыя, якая аб'ядная блізка 60-ці тысяч арганізаваных рабочых.

Міжнародны зьезд прыяцеляў СССР.

Ад ЦК УсеКП(б).

Усім ЦК нацкампартый, крайкомам, абласкомам, губкомам і акругкомам УсеКП(б).

Да надыходзячага міжнароднага зьезду прыяцеляў СССР і сьвяткаваньня 10-ых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі чакаецца прыезд вялікае колькасьці рабочых, сялянскіх і іншых дэлегацый. Бяручы пад увагу вялічэзнае значэньне гэтых дэлегацый у справе ўзмацненьня братэрскае сувязі рабочых і сялян СССР з працоўнымі капіталістычных і калёніяльных краёў, ЦК прапануе ўсім арганізацыям загадзя ўжыць належныя захады, каб у выпадку прыезду ў іх райёны чужаземных дэлегацый, апошнім былі забясьпечаны самыя ўважлівыя адносіны і дапамога на ўсім.

ПЕРШАЯ СПРАВАЗДАЧА АМЭРЫКАНСКАЕ РАБОЧАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ АБ СССР.

НЬЮ-ЁРК, 26-9. Амэрыканская рабочая дэлегацыя, якая наведалася ў СССР, прыехала сёньня ў Нью-Ёрк.

Дэлегацыя мяркуе ў працягу бліжэйшых 2-х тыдняў агаласіць сваю справаздачу аб падарожжы. Пакуль-што ў кароткім паведамленьні дэлегацыі зазначана: «На дэлегацыю зрабіў вялічэзнае ўражаньне бадзёры дух, якім прасякнуты рабочыя СССР». Далей паведамленьне кажа, што **ў СССР рабочыя бяруць актыўны ўдзел у жыцьці краю. Узровень вытворчасьці і рэальны заработак вышэй, чымся да вайны; прыватны капітал зьмяншаецца, капэрацыйны-ж, наадварот, расьце; прафсаюзы ў СССР зьяўляюцца магутную сілаю і зусім не знаходзяцца пад кантролем ураду.**

Нарэшце дэлегаты заяўляюць, што па іх пераконаньні СССР жадае спакою.

Пад знакам клясавае барацьбы.

Зьезд ангельскага рабочага руху меншасьці.

ЛЁНДАН, 26-IX. Сёньня ў Лёндане адчынілася другая гадавая канфэрэнцыя левага крыла ангельскага рабочага руху, у якой бярэ ўдзел 145 дэлегатаў – прадстаўнікоў ад 156.337 арганізавых рабочых.

Канфэрэнцыя аднагодна ўхваліла прапанаваную часовым камітэтам праграму левага крыла. Праграма дамагаецца адмовы ад Лёкарнскае згоды, ад Вэрсальскага ўгавору, ад плану Даўэса і патрабуе скасаваньня ўсіх міжнародных даўгоў. Далей праграма патрабуе аднавіць поўныя дыпляматычныя і гандлёвыя зносіны з СССР, рашуча дапамагчы нацыянальна-рэвалюцыйнаму руху ў Кітаі, а таксама неадкладна вывесьці ўсе ангельскія вайсковыя сілы з Кітаю. У галіне калёніяльных пытаньняў праграма дамагаецца рашучае дапамогі рабочаму і сялянскаму руху ва ўсіх частках брытанскае імперыі і ў асобку дапамогі працоўным масам Індыі ў іх барацьбе проці ангельскага імпэрыялізму.

У рэзалюцыі аб палітычным становішчы зазначана: „Непасрэднаю задачаю рабочае клясы Англіі зьяўляецца зьмяншаньне патройнага націску ангельскага капіталізму, што выяўляецца ў наступе на ангельскіх рабочых, у вайне проці Кітаю і ў пагрозе наскоку на СССР. Выканком рабочае партыі супольна з генэральнаю радаю саюзаў павінен арганізаваць у нацыянальным абхваце кампанію, якая перашкодзіла-б наскоку на СССР і Кітай, а таксама забясьпечыла-б заняпад ураду Бальдвіна і ўтварэньне сапраўднага рабочага ўраду". Гэтая рэзалюцыя ўхвалена канфэрэнцыяй з дадаткам, у якім заяўляецца востры пратэст проці зрыву англа-расейскага камітэту, ухваленага зьездам прафсаюзаў у Эдынбурзе.

Ухваленая рэзалюцыя па пытаньні аб надыходзячай канфэрэнцыі рабочае партыі падкрэсьлівае, што выканком рабочае партыі праводзіць раскольніцкую палітыку, выключаючы з партыі камуністаў і арганізацыі, якія адмаўляюцца выключыць камуністаў. Рэзалюцыя востра ганьбіць такую палітыку і пратэстуе проці таго, што выканком адмовіўся далучыць да парадку дня надыходзячае канфэрэнцыі рабочае партыі некалькі прапанаваных мясцовымі арганізацыямі рэзалюцый, якія дамагаюцца скасаваньня ліквідацыйных настаноў аб выключэньні камуністаў.

Апроч таго, ухвалены тры надзвычайныя, г. зв. не прадугледжаныя ў парадку дню рэзалюцыі. Першая з іх адзначае, што ўведзеныя новым законам аб прафсаюзах абмежаваньні права прафсаюзаў зьбіраць з сваіх сяброў узносы на палітычныя мэты выкрываюць сапраўдны характар капіталістычнае „дэмакратыі" і заклікае ўсіх сяброў прафсаюзаў дабраахвотна рабіць узносы на палітычныя мэты. Другая рэзалюцыя дамагаецца вызваліць усіх палітычных вязьняў, як у Англіі, так і ў межах усяе Брытанскае імперыі і заклікае надтрымаць ангельскую секцыю МОПР'у. Трэцяя—пратэстуе проці скасаваньня ўрадам напартыі, выданага камуністычнаму дэпутату Саклатвале на падарожжа ў Індыю.

Рэвалюцыйнае войска спаткана у Сватоу з захапленьнем.

КАНТОНСКІ ДЫКТАТАР ЗАТРАБАВАЎ АД НАНКІНА ПАДМАЦАВАНЬНЯЎ.

СПАТКАНЬНЕ РЭВАЛЮЦ. ВОЙСКУ У СВАТОЎ.

У ГОРАДЗЕ ЧЫРВОНЫЯ СЬЦЯГІ,—ПАЛІТЭЯЗЬНІ ВЫЗВАЛЕНЫ

ШАНХАЙ. 26-IX. Кітайскія газэты паведамляюць, што рэвалюцыйнае войска захапіла Сватоў а 5-й гадз. увечары 23-га верасьня. Чыгунка ля Сватоў была зруйнавана адступіўшай арміяй генэрала Ван-Цзуна, але рэвалюцыйнае войска паправіла зруйнаваньні.

Яшчэ да ўваходу рэвалюцыйнага войска горад літаральна напоўніўся партызанскімі сялянскімі атрадамі якія з уздымам віталі войска Іе-Ціна. Вуліцы былі перапоўнены рабочымі і сялянамі, якія насілі на рукавох чырвоныя павязкі дабрахвотнікаў. **Над горадам віліся чырвоныя сьцягі.** Усюды распаўсюджваліся лістоўкі і былі разьвешаны плякаты з рэвалюцыйнымі надпісамі.

Палітычныя вязьні вызвалены з усіх гарадзкіх астрогаў. Парадак у горадзе поўны.

ПОЎДЗЕНЬ КІТАЮ ЯШЧЭ ДАЛЁКА НЕ АБ'ЯДНАНЫ

Пад уладаю новага ўраду толькі 3 правінцыі.—Тан-Шэн-Чы парывае з Нанкінам.

ШАНХАЙ, 25-IX. Кітайскія палітычныя колы адзначаюць, што ўтварэньне новага нанкінскага ўраду, складзенага з прадстаўнікоў трох гаміндаўскіх груп (нанкінскае, уханскае і сіншанскае), зусім не азначае сапраўднага аб'яднаньня ўсіх паўдневых груповаў. Поруч з новым нанкінскім урадам у Ханькоу ізноў узьнікае другі палітычны цэнтр на чале з генэралам Тан-Шэн-Чы.

Урада новага нанкінскага ўраду на практыцы распаўсюджваецца толькі на правінцыі Цьзянсу, Чжэцьзян, Фуцьзян і частку Цьзянсі. Што-ж датычыць другое часткі Цьзянсі, а таксама Хунані, Хубэю і Аньхуэю, дык гэтыя правінцыі знаходзяцца пад уладаю Тан-Шэн-Чы, прычым з кожным днём пашыраюцца чуткі, што Тан-Шэн-Чы абвесьціць „незалежнасьць" тэрыторыі, якую ён кантролюе.

У Ханькоу адбылася нарада бліжэйшых супрацоўнікаў Тан-Шэн-Чы. Японскае агенства паведамляе, што на гэтай нарадзе ўхвалена прызнаваць новы нанкінскі ўрад толькі „дэ-факто".

ЗАЧЫНЕНЬНЕ ХАНЬКОЎСКАГА ДЭРЖБАНКУ.

ШАНХАЙ, 25-IX. Па загадзе Тан-Шэн-Чы ліквідуецца цэнтральны банк у Ханькоу. Справы банку здаюцца спэцыяльна назначанай камісіі.

Чан-Кай-Шы ў Шанхаі.

ШАНХАЙ, 25-IX. Паведамляюць, што ў часе пабыту ў Шанхаі Чан-Кай-шы яго наведалі Ху-Хан-Міп, Учжао-Чу і інш. Чан-Кай-шы рашуча адмовіўся вярнуцца да актыўнае палітычнае дзейнасьці, але выказаў надзею, што створанае ў Нанкіне аб'яднаньне «акажацца жыцьцяздольным».

Сючэн пакідае палітычную дзейнасьць.

ШАНХАЙ, 26-9. Ранейшы міністр юстыцыі ўханскага ўраду Сю-чэн у агалошанай заяве завярас, што насупроць абвінавачаньням проці яго, ён ніколі ня «спрыяў камуністам», а наадварот, зараз-жа пасьля расколу ў красавіку (г. зн. пасьля перавароту Чан-Кай-Шы) дамагаўся разрыву з камуністамі. Аднак, заяўляе Сю-чэн, з прычыны таго, што яго абвінавачваюць з усіх бакоў, ён лічыць сабе прымушаным пакінуць палітычную дзейнасьць.

Працэс 16-ці камуністаў ў Дайрэне.

УЛАДЫВАСТОК, 25-IX. 16-га верасьня ў дайрэнскім акруговым судзе распачаўся разгляд справы 16-ці кітайцаў, абвінавачаных у арганізацыі дайрэнскага мясцовага камітэту кампартыі, з мэтаю барацьбы з капіталізмам і ажыцьцяўленьня проціімпэрыялістычных камуністычных ідэй. Як гаворыцца ў абвінавачальным акце, у арганізацыю дайрэнскага камітэту, якая мела 32 аддзяленьні, уваходзіла больш 220 кітайцаў—рабочых дайрэнскіх галоўных майстэрняў, служачых Паўднёва-Манчжурскае чыгункі і студэнтаў.

НА МАНЭЎРАХ. (Гляді 2 стар.).

Плён „клясавага супрацоўніцтва" ў Англіі.

КАПІТАЛ АДНАВІЎ НАСТУП НА РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

ЛЁНДАН, 26-IX. Пастаянныя заклікі лідэраў трэд'юніёнаў да прамысловага спакою ўзмацняюць у прадпрыёмцаў думу наконт нездольнасьці ангельскага прафэсыянальнага руху арганізаваць адпор Адэнэ з буйных жалезарабных і сталеробных прадпрыёмцаў з „Дорман Лёнг і кампаніа" папярэдзіў рабочых аб павялічэньні працоўнага дню з 8-мі на 10 гадзін, прычым замест трох зьмен па 8 гадзін устанаўляе дзьве 10-цігадзінныя зьмены. У зьвязку з гэтым рабочыя, якія да гэтага часу былі заняты на сярэдняй зьмене, разбаўляюцца працы.

Сацыял-прадажнікі паралізуюць волю рабочых.

ЛЁНДАН, 26-IX. У нядзелю ў Манчэстары адбыўся традыцыйны „чыгуначны карнавал", які як чыгуначная кампанія, так і прафсаюзы чыгуначнікаў выкарысталі з мэтаю прапаганды клясавага супрацоўніцтва.

Брамлей (саюз машыністаў і кочагараў) у сваёй прамове, між іншым, заявіў так: „Мы павінны распаўсюдзіць сваё давер'е і на асоб, якія стаяць на чале чыгунак і кіруюць імі; мы павінны ісьці наперад па шляху братэрства і адзінасьці, якія павінны ахапіць усю структуру чыгуначных служачых. Мы ўсе павінны скласьці адну валікую суцэльную самыю", — скончыў Брамлей.

Барацьба ў Латвіі за гандлёвы ўгавор з СССР

ВОРАГІ ЎГАВОРУ ПРЫЗНАЮЦЬ СВАЁ ПАРАЖЭНЬНЕ.

РЫГА, 26-9. Газэта «Пірмт'єнас Рытс», якая праз увес час выступае проці зацьверджаньня савецка-латвійскага гандлёвага ўгавору, у сёньнешнім нумары выказвае небясьпеку, што ў сучасны момант большасьць сойму за зацьверджаньне ўгавору забясьпечана.

Учора адбыўся мітынг тэкстыльшчыкаў, на якім была ўхвалена рэзалюцыя з патрабаваньнем, каб сойм зацьвердзіў савецка-латвійскі гандлёвы ўгавор у самым неадкладным парадку.

У Польшчы.

На зьезьдзе польскіх чыгуначнікаў.

ВАРШАВА, 26-IX. У Варшаве адчыніўся зьезд прафсаюзу чыгуначнікаў. [redacted] аб'ядноўвае 66 тысяч чалавек, [redacted] складае 34 проц. агульнага ліку чыгуначнікаў у Польшчы.

На зьезд прыбылі дэлегацыі чужаземных арганізацый чыгуначнікаў, а таксама прадстаўнік Інтэрнацыяналу транспартнікаў Натанс, які, выступаючы з прывітальнаю прамоваю, між іншым заявіў, што транспартнікі ўжывуць усе меры, каб удзягнуць у свой Інтэрнацыянал савецкіх чыгуначнікаў. Натанс падкрэсьліў, што ён гаворыць гэта як ад імя Інтэрнацыяналу транспартнікаў, так і ад імя ангельскае рабочае клясы.

Лётная катастрофа.

24 верасьня г. г. ў Лавіцы каля Познані ўпаў аэраплян і разбіўся ўшчэнт. Пілёт нар. Піхлер цяжка паранен.

«Трэці Нясьвіж».

«Gaz. «War. Por.» паведамляе, што ходзяць нагалоскі аб тым, што робяцца стараньні, каб наступная канфэрэнцыя прадстаўнікоў кансэрватыўных узгрупаваньняў і санатараў (пілсудчыкаў) адбылася ў Польшчы, дзе арганізацыяй яе займаецца п. Хлапоўскі.

У Літве.

Замах на парахавы склад.

20 верасьня каля ковенскіх парахавых складаў пачалася страляніна, якая была чутна ў горадзе. Аказалася, што некалькі чалавек хацелі прабрацца да складаў амуніцыі. Патруль стаў страляць у іх і потым затрымаў. Вядзецца сьледзтва.

Рэпрэсіі ў Літве.

Па распараджэньні камэнданта гор. Коўні 14 асоб высланы ў канцэнтрацыйны лягер у Ворнях.

Літоўскія аэрапляны над польскай тэрыторыяй.

Апошнімі днямі, як паведамляюць польскія газэты, было два выпадкі, калі літоўскія самалёты залятаі на польскую тэрыторыю. Аэрапляны ляталі над станцыямі Турмонт і Ігналіна.

Літвою кіруе взяшчына.

Латвійскі «Socjaldemokrat» піша, что пасьля Таўрогенскага паўстаньня Літвою фактычна кіруе афіцэрскі камітэт, на чале якога стаяць міністр вайсковых спраў Даўкантас і палкоўнік Пехавічас.

Манэўры шаўлісаў.

18 верасьня г. г. ў Літве адбыліся манэўры Марыямпольскага і Выкавыскага аддзелаў шаўлісаў. У манэўрах прымалі ўдзел пешыя стральцы, конныя і кулямётныя команды.

Літоўска-польскія адносіны.

Інфармацыйны бюлетэнь бюро друку літоўскага міністэрства замежных спраў, абгаварваючы польска-літоўскія стасункі, піша:

«У стасунках з Польшчай належыць чакаць, што яны не застануцца вечна такімі, як цяпер. Быць можа, не далёкі той час, калі польская палітыка зьменіць кірунак, і літоўскі ўрад будзе магчы зьдзейсьніць намеры, выказаныя ў урадавай дэкларацыі».

За дзень.

Кітайская рэвалюцыя жыве.

Кітайская рэвалюцыя жыве ў мілённых масах працоўнага сялянства і рабочае клясы, якія пад кіраўніцтвам кітайскай кампартыі змагаюцца за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Кітайская рэвалюцыя жыве, ня гледзячы, што яе асноўны кіраўнік і арганізатар—партыя Гаміндан здрадзіла рэвалюцыі, прадала інтарэсы працоўных масаў, перайшла ў лягер контр-рэвалюцыі.

Факт заняцьця Сватоу паўстанскімі сялянскімі атрадамі гаворыць аб тым, што здрадніцкім генэралам не ўдалося прыдушыць рэвалюцыйны рух і імкненьне сялян да аграрнай рэвалюцыі. Той факт, што Сватоу заняты імена партызанскімі атрадамі яшчэ да таго, як да гораду падышлі вайсковыя аддзелы рэвалюцыйных генэралаў Іе-Ціна і Хо-люва, гаворыць аб тых глыбокіх карэньнях, як'я аграрная рэвалюцыя пусьціла ў глыбокія пласты кітайскага сялянства і аб тым, што кітайскім камуністам удалося накіраваць сялянскі рух у правільную логву, у напрамак барацьбы з [redacted]аёй і чужаземнай буржуазеяй і абшарнікамі.

У Сватоу зноў паўтарылася тая самая гісторыя, якая была ў часе падыходу нацыянальна - рэвалюцыйнай арміі да Шанхаю, калі паўстаўшыя рабочыя Шанхаю захапілі горад яшчэ да ўступленьня рэгулярнага войска ў Шанхай. Гістарычны факт застанецца, што не Чан-Кай-Шы ўзяў Шанхай, а паўстаўшыя рабочыя, якія разграмілі войска паўноччаў, перадалі горад у рукі Чан-Кай-Шы. Гэтае-ж самае адбылося ў Сватоу: сяляне-паўстанцы перадаюць горад у рукі рэвалюцыйнага войска Іе-Ціна. Здрадніцтва, учыненае Чан-Кай-Шы, стварыла глыбокі разрыў паміж імі і шырокімі масамі. Камуністычнае кіраўніцтва войскам Іе-Ціна злучыць у адно рэвалюцыйную армію з шырокімі рабочымі і сялянскімі масамі, што створыць патрэбныя ўмовы для перамогі.

Шлях рэвалюцыйнай арміі на Кантон ачышчаны. Супольнымі сіламі Кантон зноў зробіцца апорай і арганізатарам кітайскай рэвалюцыі.

Падарожжа амэрыканскага легіёну.

Арганізатары ўрачыстасьці амэрыканскага легіёну ў Парыжы не здаволіліся правалам свайго сьвяткаваньня ў Парыжы і пераводзяць іх у Ніцу, Монтэ-Карлё, Геную і Рым. Працоўныя масы Францыі ў адказ на падхалімства сваёй буржуазеі, якая рыхтавалася ўрачыста сустрэць амэрыканскіх фашыстаў у сваёй сталіцы, адказалі поўным байкотам гэтых сьвят і ў супроцьвагу ім арганізавала дэманстрацыі сіл працоўных, якія рыхтуюць помсту і расправу са сваёй і чужой буржуазеяй.

Амэрыканскія легіянэры (чытай фашысты) езьдзілі ў Парыж скакаць і весяліцца, але ім у гэтым перашкодзілі працоўныя Францыі. Зараз яны едуць у Монтэ-Карлё, каб там у гульні ў карты і ў рулетку папоўніць сваё вясельле. Падарожжу амэрыканскіх фашыстых у Рым ня можна ня прыдаць палітычнага значэньня, бо асабліва ў апошнія часы рымскія фашысты пачынаюць зьвязвацца з іх хаўрусьнікамі ў Амэрыцы—легіянэрамі. Нелегальны саюз амэрыканскіх фашыстаў Ку-Ку-Кланс уступае сваё месца легальнаму і нават дзяржаўнаму саюзу амэрыканскіх легіянэраў, якія, карыстаючыся падтрыманьнем улады на мясцох, руйнуюць арганізацыі амэрыканскіх рабочых.

Амэрыканскі фашызм, які раней хаваўся пад маскай саюзу франтавікоў, пачынае ўсё больш выяўляць свой сапраўдны твар, які ён зьбіраецца афіцыйна аформіць у саюзе з італьянскімі фашыстамі.

Сьляпыя пачынаюць бачыць.

Тыдні два таму назад вядомы польскі палітык Леон Васілеўскі, які напісаў некалькі кніжак аб беларускім і літоўскім руху, прычытаў у Варшаве па радыё лекцію на тэму: **«Сучасны стан беларускага народу».**

Пан Васілеўскі пісаў аб беларусах яшчэ ў 1906 г., калі беларускі адраджэньцкі рух толькі што пачынаўся. У польскім грамадзянстве хадзіла тады такая насьмешлівая гутарка: усіх беларусаў можна зьмясьціць на... адным канапе. **Тады** і пан Васілеўскі глядзеў на беларускі рух вачыма усіх...

Але, і пасьля таго, як беларускі рух значна вырас, пашырыўся і паглыбіўся і выліўся нават у дамаганьне незалежнасьці, калі ўрэшце пачалося сапраўднае беларускае будаўніцтва ў БССР, а адначасна расьлі, як грыбы пасьля дажджу, беларускія школы наабапал польска-савецкай дзяржаўнай мяжы,—п. Васілеўскі ўсё яшчэ глядзеў на беларускі рух, як і дваццаць гадоў таму назад!

Аднак, у апошнія гады сталася нешта такое, што і самых блізарукіх палітыкаў прымусіла прымеціць тую вялізарную творчую сілу, якая крыецца ў збуджаным да новага жыцьця беларускага народу.

Магутны ўзрост культурнай працы ў БССР—з аднаго боку,—стыхійны, масавы рух у Зах. Беларусі, які выявіўся і ў часе выбараў у сойм і санат у 1922 г. і цяпер—пры выбарах у самаўрады і пры школьным плебісьцыце і ўрэшце—у тварэньні масавае сялянска-работніцкае арганізацыі ў вёсках і гарадох,—усё гэта нават і сьляпым расчыніла вочы на жыцьцёвую сілу нашага адраджэнчага руху.

Міліёны сьвядомых і нацыянальна і сацыяльна сялян і работнікаў складаюць і творыць цяпер беларускае адраджэньне. Гэтую непераможную сілу ня здолеюць зламаць ні ворагі чужынцы, ні свае ўласныя здрадзікі і прадажнікі...

Пан Васілеўскі мусіў урэшце гэта сьцьвердзіць у сваёй апошняй лекцыі.

Як бачым, знарок заплюшчаныя вочы ўрэшце расчыніў[illegible]

ЗАМАХІ НА ПОЕЗД З АМЭРЫКАНСКІМІ ЛЕГІЯНЭРАМІ.

Пагроза новых рэпрэсій і высылак з Францыі.

ПАРЫЖ, 26-9. Начальнік амэрыканскага лігіёна і некалькі сот легіянэраў выехалі ў суботу ўвечары з Парыжу двума спэцыяльнымі поездамі ў Ніцу, адкуль яны павінны праехаць ў Монтэ-Карлё, Геную і Рым.

Правая прэса справае вялікі сувязь між прыездам амэрыканскіх легіянэраў у Ніцу і трыма спробамі нападзіць чыгуначнае крушэньне ўночы з суботы на нядзелю на чыгуначнай калёіне ўздоўж Лазурнага берагу незадоўга да праходу поезда з легіянэрамі. Паконт гэтага «Юманітэ» піша: распачатае намі спэцыяльнае расьсьледваньне дазволіць вылавіць сапраўдныя разьмеры гэтае справы, якая, як відаць, груба перавялічана, каб даць права паліцэйскім рабіць аблавы сярод «западазроных» італьянскіх рабочых, а таксама для высылак і арыштаў.

Гвалтоўны акт францускага ўраду.

МАСКВА. У канцы верасьня ў Бордо (Францыя) адчыняецца кангрэс унітарнае канфэдэрацыі будаўнікоў Францыі.

ЦК саюзу будаўнікоў СССР, атрымаўшы запросіны на кангрэс, вылучыў у якасьці дэлегата Багданава. **Французкі ўрад адмовіў яму ў выдачы візы.** ЦК будаўнікоў паслаў кангрэсу тэлеграму, у якой пасылае братэрскае прывітаньне будаўнікам Францыі і выказвае пратэст проці ўчынкаў францускага ўраду, разглядаючы іх, як акт недапусьцімага ўмешваньня ў справы рабочых арганізацый.

Лёкаут індыйскіх чыгуначнікаў.

ЛЁНДАН, 26-9. Лёкаут на чыгунцы Калькута—Нагпур ня спыняецца. Ангельскія газэты паведамляюць пра сур'ёзныя непакоі сярод чыгуначнікаў, выкінутых на вуліцу. Урад адмаўляецца выступіць у ролі пасрэдніка.

Адначасна пасьпявае канфлікт на Паўднёва-Індыйскай чыгунцы, дзе зволена 3 тысячы рабочых чыгуначных майстэрняў.

Муніцыпальныя выбары ў Нямеччыне.

Паражэньне буржуазных партый.

БЭРЛІН, 26-IX. Учора ў шмат якіх акругах прыморскае паласы адбыліся выбары ў органы гарадзкога самакіраўніцтва. Ва ўсіх акругах лік галасоў, пададзеных за камуністаў і сацыял-дэмакратаў, перавышае лік галасоў, атрыманых буржуазнымі партыямі.

Адмова швэйцарскіх рэфармістаў ад клясавае барацьбы.

БЭРЛІН, 24-9. 24-га верасьня ў Інтэрлякене адчыніўся зьезд рэфармісцкага аб'яднаньня швэйцарскіх прафэсыянальных саюзаў. На парадку дню зьезду, між іншым, стаіць пытаньне аб выключэньні з статуту аб'яднаньня ўсіх пунктаў, вытрыманых у духу клясавае барацьбы.

НІКЧЭМНЫЯ ВЫНІКІ ЖЭНЕЎСКІХ НАРАД.

БЭРЛІН, 26-9. Пасьля канца спрэчак аб гарантыях бясьпечнасьці, арбітражы і разброеньні пленум Лігі Нацый ўхваліў адногласна 5 пастаноў, пададзеных на пленум камісіяй Лігі Нацый аб разброеньні. Першая пастанова зьмяшчае патрабаваньне, каб цывільная авіяцыя разьвівалася выключна дзеля эканамічных, але не ваенных мэтаў. У другой і трэцяй пастановах гаворыцца аб на магчымасьці хутчэйшым скліку Лігі Нацый і выпрацоўцы пастаноў у выпадку міжнародных канфліктаў. Чацьвертая пастанова датычыць прапановы Фінляндыі загадзя арганізаваць фінансавую дапамогу краём, якія могуць аказацца аб'ектамі нападу. Пятая пастанова, найбольш важная, зьмяшчае ўжо паведамленьне кампрамісную рэзалюцыю нямецкае, французкае і галяндзкае дэлегацый, ўхваленую ў камісіі аб разброеньні.

Арыентацыя Нямеччыны ў бок Англіі.

БЭРЛІН, 26-9. Назначаная ў Жэневе нямецка-бальгійская канфэрэнцыя ў справе агалашэньня сакрэтнае перапіскі, якая датычыцца вольных стралкоў, паўрад ці адбудзецца. Напружанасьць у нямецка-бальгійскіх і нямецка-французкіх адносінах значна узросшую за час сучаснае сэсіі Лігі Нацый у жэнеўскіх колах скільны растлумачыць ня толькі рознагалосьсямі ў пытаньні аб адказнасьці за вайну, але таксама і выразнаю арыентацыяю Нямеччыны ў бок Англіі.

Французкая рэакцыя ня сунімае цкаваньня СССР.

Пратэст к-ту захаваньня франка-расейскіх зносін.

ПАРЫЖ. 26-IX. Орган Мільерана «Авэнір», заяўляючы, што «апэрацыя, якая прапануецца Ракоўскім, будзе праведзена за кошт Францыі», абуран тым, што французкая дэлегацыя лічыць сур'ёзнымі савецкія прапановы ў зьвязку з падыходзячымі выбарамі.

Лева-буржуазная «Волёнтэ» наконт савецкіх прапаноў піша: «Паўрад ці ад СССР, зморанага вайною і рэвалюцыяй, можна было атрымаць больш. Утварэньне ўгавору аб непападзе было-б вялічэзным крокам на шляху да замацаваньня спакою ў Эўропе. Ухіліцца ад упарадкаваньня даўгоў у сучасны момант азначала-б учыніць буйную памылку, шкодную для інтарэсаў Францыі і захаваньня спакою; гэта быў-бы варожы акт у дачыненьні да дробных французкіх крэдыторaў».

Камітэт захаваньня франка-расейскіх зносін агалошвае пратэст проці небясьпекі разрыву. Орган сацыялістаў «Популер» зьмяшчае такі вынятак з пратэсту: «У момант, калі памячаецца магчымасьць упарадкаваць пытаньне аб царскіх даўгох, камітэт захаваньня франка-расейскіх зносін зварочваецца да рэспубліканцаў і патрабуе ад іх несадкладных дзеяньняў, з мэтаю пер

У Саюзных рэспубліках.

НА ВЯЛІКІХ АДЭСКІХ МАНЭЎРАХ.

Чырвоны флёт здольны абараніць СССР.

З загаду тав. Варашылава.

Агалошаны загад Наркома па вайсковых і марскіх справах і Старшыні Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР Варашылава адзначае, што мінулае лета Чырвоны Чорнаморскі флёт правёў у наўружанай вучобе. Затрачаныя сілы не прапалі даремна.

„У трывожныя гады,—зазначана ў загадзе,—калі сусьветныя драпежнікі спрабуюць арганізаваць новы „крыжавы паход“ проці рэспублікі працы, працоўныя СССР могуць быць упэўнены, што ў асобе Чырвонага Чорнаморскага флёту яны заўсёды будуць мець вернага і грознага абаронцу заваёў Кастрычніка.

Арганізуем абарону.

Выступленьне тав. Варашылава на пленуме Адэскага гарсавету.

АДЭСА. Выступаўшы сёньня ўвечары на пашыраным пленуме Адэскага гарсавету (брала ўдзел больш 8.000 чал.). Варашылаў падрабязна спыніўся на задачах умацаваньня абароназдольнасьці СССР.

„Зараз—сказаў Варашылаў—нашы вораги разглядаюць паходы камсамольцаў і членаў ОСО-Авіяхіму, а таксама манэўры, як братаньне са зброяй. Усё гэта не павінна нас непакоіць. І вы павінны нашу працу весьці і далей з яшчэ большаю настойлівасьцю. Нашая сацыялістычная дзяржава абавязана ўжыць усе меры, каб да пачатку валічэснае бойкі, якая можа канчаткова вызначыць далейшы лёс чалавецтва, мы былі магчыма мацней арганізаваны, каб мы былі на справе гатовы да рашучае барацьбы“.

Партпраца на буйных прадпрыёмствах.

Пастанова ЦК УсеКП(б).

МАСКВА. У рэзалюцыі ЦК УсеКП(б) аб партыйнай працы на буйных прадпрыёмствах зазначана, што не зважаючы на значны рост і ўмацаваньне за апошнія гады вытворчых ячэек, у асобку ячэек буйных прадпрыёмстваў, партыйная праца ў некаторых з такіх ячэек, у якіх пры гэтым часта аб'яднаны на прадпрыёмствах значныя масы рабочых (3-5 тысяч), мае сур'ёзныя недахопы. Між тым, буйныя прадпрыёмствы павінны зьяўляцца асноўнымі дэтрамі палітычнага жыцьця на мясцох, і значэньне ячэек гэтых прадпрыёмстваў у мясцовых арганізацыях павінна адпавядаць палітычнаму і гаспадарчаму значэньню прадпрыёмстваў, на якіх яны працуюць.

У зьвязку з гэтым ЦК прызнае патрэбным: усямерна ўзмацніць партыйную, прафэсыянальную і наогул усю масавую працу на буйных прадпрыёмствах, дамагаючыся, каб буйныя прадпрыёмствы на справе адыгрывалі рашаючую ролю ва ўсім партыйна-грамадзкім жыцьці; узмацніць адзінства партыйнага кіраўніцтва на прадпрыёмствах праз палепшаньне кіраўніцтва з боку бюро агульна-заводзкіх арганізацый усёю партыйнаю працаю з тым, каб яны сапраўды кіравалі і дапамагалі ў працы цэхавых ячэек; усебакова ўзмацніць заводзкія ячэйкі працаўнікамі са значным вопытам партыйнае працы, прычым пры перакідцы працаўнікоў, вылучаных на даным прадпрыёмстве, трэба мець на ўвазе ў першую чаргу патрэбу забясьпечыць палепшаньне партыйнае і прафэсыянальнае працы на самім прадпрыёмстве.

Пераносячы значную частку партыйнае працы ў цэхі, трэба дамагчыся выхаваньня трывалага актыву навакол бюро цэхавых ячэек, палепшыць кіраўніцтва цэхавае ячэйкі пізавым партактывам, зварочваючы ў першую чаргу ўвагу на больш уважливы падбор партарганізатараў-агітатараў і працаўнікоў, на іх замацаваньне і спэцыялізацыю па асобных галінах працы.

На буйных прадпрыёмствах са значным ужываньнем жаночае працы належыць у агульнай працы ячэек больш адбіваць асаблівасьці працы сярод работніц з тым, каб праца сярод іх зьяўлялася асноўнаю працаю партыйных і прафэсыянальных арганізацый у цэлым.

Пераглядзець (у бок спрашчэньня) у цэхах арганізацыйную структуру грамадзкіх арганізацый, якія ў шмат якіх выпадках перагружаюць і затрымліваюць пагоджаную працу ў цэху. Працу арганізацый, якія могуць праводзіць яе па-за сьценкамі цэху, перавесьці ў заводзкія клюбы, а арганізацыі, што застаюцца ў цэхах, належыць увязаць між сабою праз палепшаньне кіраўніцтва імі з боку цэхавых ячэек.

Разгрузіць кіраўнікоў ячэек ад прадстаўніцтва ў арганізацыях, якія адрываюць іх ад непасрэднае працы. Дамагацца таксама, каб прымацаваньня да ячэек кіруючыя працаўнікі партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый актыўна ўдзельнічалі ў правядзеньні штодзённае партыйнае працы цэхавых ячэек. На асобных прадпрыёмствах, дзе партыйная праца мае найбольш буйныя недахопы, адпаведныя партарганізацыі павінны ўжыць захады да яе палепшаньня. Даручыць інструктарам ЦК пры абсьледваньні зварочваць асаблівую ўвагу на працу партарганізацый буйных прадпрыёмстваў.

Падрыхтоўка да 10-е гадавіны Кастрычніка.

Лёзунгі на воблаках.

ЛЕНІНГРАД. У дні кастрычнікавае ўрачыстасьці ў Ленінградзе будзе выкарыстана арыгінальная вынаходка, якая дае магчымасьць увечары адбіваць на хмарах розныя лёзунгі. Літары, якія адбіваюцца на хмарах, дасягаюць разьмераў у адну мілю кожная.

Дні Кастрычніка ў школах РСФСР.

На апошнім пасяджэньні калегіі НК Асьветы быў заслухан даклад аб падрыхтоўцы да 10-ых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі. Галоўсацвых распрацаваў праграму правядзеньня дзён Кастрычніка ў школах. У праграму ўваходзіць арганізацыя выставак, масавых дзіцячых сьвяткаваньняў, экскурсій бацькоў у школы і г. д. Школьнікам выпускнікам будуць раздаены спэцыяльныя выданьні «Памятка вучняў», дзе будзе зьмешчан ліст савецкае ўлады да будучых грамадзян савецкае Расеі, партрэты правадыроў і некаторыя каляндарныя даты рэвалюцыйных падзей.

Апроч таго Галоўсацвых выпушчае кіно-фільмы «Школа раней і цяпер», «Чырвоны мак» (з жыцьця бясспрытульных) і «Дашкольнае выхаваньне—заваёва Кастрычніка».

Галоўпрафасьветы заняты распрацоўкаю праграмы спэцыяльнага курсу для ВНУ (вышэйшых навучальных устаноў) па гісторыі Кастрычнікавае рэвалюцыі. Гэты курс будзе ўведзен у сёлетнім навучальным годзе ва ўсіх ВНУ. У праграмы грамадазнаўства для тэхнікумаў уводзіцца выкладаньне вестак аб Кастрычнікавай рэвалюцыі. Выдаецца спэцыяльны зборнік, прысгасаваны да ніжэйшае прафтэхнічнае асьветы ў рабочай школе. У дзяржаўных і мясцовых музэях будуць адчынены аддзелы на тэму: «10 гадоў барацьбы і будаўніцтва».

Выстаўка дасягненьняў прамысловасьці СССР.

МАСКВА. Старшыня ВСНГ СССР Кубышаў канчатнова санкцыянаваў арганізацыю ў ЛЕНІНГРАДЗЕ ўсесаюзнае выстаўкі дасягненьняў савецкае прамысловасьці.

Ідэя арганізацыі выстаўкі спаткана з вялікаю прыхільнасьцю ў розных колах нашых гаспадарцаў і грамадзкіх працаўнікоў. Ёю кладзецца пачатак вялічэзнай гістарычнай справе.

Посьпех пазыкі індустрыялізацыі.

РАСТОЎ-ДОН. 26-IX. Скончаная сёньня папярэдняя падпіска на пазыку індустрыялізацыі дала на Растову больш 340 тысяч рублёў.

Цікавасьць да пазыкі сярод прыватных дзелавікоў.

МАСКВА. Група прадстаўнікоў прыватнага капіталу Масквы зьвярнулася да старшыні маскоўскага біржавога камітэту тав. Мальшава з прапановаю дапамагчы ў справе распаўсюджаньня пазыкі індустрыялізацыі сярод гандляроў, саматужнікаў, рамесьнікаў і асоб вольных прафэсій, якія выказваюць жвавую зацікаўленасьць пазыкаю.

32 млн. руб. страт ад земляздрыгу ў Крыме.

СІМФЭРОПАЛЬ, 26-IX. Адчынілася скліканая па ініцыятыве КрымЦВК шырокая нарада, прысьвечаная земляздрыгу.

У ходзе працы нарады выявілася, што земляздрыг убывае. Па ўсім Крыме ізноў пачалося добрае надвор'е. У Эўпаторыі купаюцца. Нагадваецца значны наплыў курортнікаў. Камісія КрымЦВК устанавіла страты ад земляздрыгу ў Крыме ў 31 млн. 819 тыс. руб. З райёнаў НАЙБОЛЬШ ПАЦЯРПЕЎ ЯЛІНСКІ—22 МЛН. 071 ТЫС. РУБ., СЕВАСТОПАЛЬСКІ—8 МЛН. РУБ., СІМФЭРОПАЛЬСКІ—1.050 ТЫС. РУБ., КАРАСУБАЗАРСКІ—186 ТЫС. РУБ., БАХЧЫСАРАЙСКІ—360 ТЫС. РУБ., СУДАКСКІ—100 ТЫС РУБ. І ЭЎПАТАРЫЙСКІ—52 ТЫСЯЧЫ РУБ.

Слабыя штурмы па ўсім Крыме.

СІМФЭРОПАЛЬ, 27-9. Ноччу 27-га верасьня зусім пязначныя штурхі адчуваліся толькі ў Ялце. Ніякіх зруйнаваньняў няма. 27 верасьня зранку былі штурхі: адзін у Гурзуфе а 6 гадз. 20 хв. сілаю ў 3 балы, адзін у Алушце, у тую-ж пару сілаю ў 3 балы і адзін слабы штурх у Эўпаторыі а 8 гадз. 40 квілін.

Анры Барбюс у гасьцях у працаўнікоў друку.

МАСКВА, 25-га верасьня ў Доме Саюзаў адбыўся вечар-спатканьне Барбюса з маскоўскімі працаўнікамі друку і рабкорамі. Вэдлуг прапановы праўленьня Дому Друку сход аднагодна абраў Барбюса гапаровым членам Дому Друку. У адказнай прамове Барбюс заявіў, што яго зьдзівіла і парадавала арганізацыя савецкага друку, пры якім радавы рабочы і селянін можа вольна выказаць свае думкі па розных пытаньнях жыцьця і будаўніцтва Савецкага Саюзу.

Ангельская каапэрацыя ня спыніць гандлю з СССР.

МАСКВА. Ангельская каапэрацыйная дэлегацыя ўдзельнічала на пасяджэньні прэзыдыуму саюзу саюзаў сельска-гаспадарчае каапэрацыі. Закранаючы пытаньне аб разрыве зносін Англіі з СССР, старшыня дэлегацыі Галяйтлі заявіў: наш урад лічыць, што ангельская каапэрацыя рызыкуе, гандлюючы з СССР. Мы пайшлі на гэтую рызыку і пойдзем на яе і ў далейшым.

Ад'езд ангельскае піянэрскае дэлегацыі.

ЛЕНІНГРАД, 26-9. 25-га верасьня пасьля 3-х месячнага пабытку ў СССР выехала дэлегацыя ангельскіх піянэраў. Для провадаў дэлегацыі каля мытнае прыстані, не зважаючы на дождж, сабралася некалькі сот піянэраў і прадстаўнікоў рабочых арганізацый. На прыстані адбыўся мітынг, на якім з разьвітальным прывітаньнем ад імя дэлегацыі выступіў малады пісьменьнік Вілі Бэкер.

Разам з піянэрамі варочаюцца ў Англію члены камсамольскае ангельскае арганізацыі Мак Кэлен і жонка члена ЦК кампартыі Англіі Галяхэр.

Прыезд у СССР быўш. міністра Коха.

МАСКВА. У Маскву прыехаў старшыня нямецкае дэмакратычнае партыі, ранейшы нямецкі міністр Кох.

Кругавы палёт па Эўропе.

МАСКВА. У бліжэйшыя дні распачынае свой кругавы эўрапейскі пералёт італьянскі лётчык Мадэлено. Пералёт пройдзе па тэрыторыі СССР, ахапіўшы частку рэчкі Дону і сакітну рэчак цэнтральнага райёну РСФСР.

Распачаўшы свой палёт з рэчкі По (Італія), Мадэлено праляціць на СССР да Ленінграду. З Ленінграду ён вылеціць у Стакгольм і далей на Эўропе.

Агульныя задачы пералёту—спартыўная і спробная.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў)

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ЖЫЛОЙ ПЛОШЧЫ.

Бабруйск, 26-9. Гарсавет заключыў 258 дагавораў на права пабудовы 271 дому. Апрача гэтага, у гарсавет пададзена 379 заяў аб адводзе вучасткаў для пабудовы будынкаў.

СЕТКА МАЛОЧНЫХ АРЦЕЛЯЎ РАСЬЦЕ.

Бабруйск, 26-9. Сетка малочных арцеляў за апошні год вырасла з 11 да 18, колькасьць каапэраванага насельніцтва ўзрасла да 1316 двароў. Сярэдняя нагрузка на 1 арцель—3500 пуд. малака.

ПОСЬПЕХ 2-ой АВІЯЛЁТАРЭІ.

Бабруйск, 26-9. Па апошніх даных акрсаветам Осо-Авіяхіму прададзена ўжо 3.650 білетаў 2-ой авіялётарэі. Зацікаўленасьць рабочых і сялян да гэтай лётарэі вялікая, што дасьць падзею па поўную рэалізацыю атрыманых Бабруйшчынай 4.500 білетаў.

КРЭДЫТАВАНЬНЕ СЯЛЯНСТВА.

Гомель, 27-9. Па пізавой сетцы сельска-гаспадарчых таварыстваў мяркуецца разьмеркаваць 90.000 руб. на крэдытаваньне сялянства акругі.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ЛЬГОТНАГА ЛЯСНОГА ФОНДУ.

Гомель, 26-9. Акруговы земаддзел разьмяркоўвае па райвыканкомах льготнага лясного фонду на 35.000 руб. Райвыканкомы ў сваім распараджэньні застаўляюць у рэзэрвы 20 проц., а рэшту разьмяркоўваюць па сельсаветах.

ШКОЛЫ ПЕРАПОЎНЕНЫ.

Віцебск, 27-9. У гарадзкія школы прынята 10.270 дзяцей, з іх 47 проц. дзяўчат. Беларускія і расейскія школы надзвычайна перапоўнены: у сярэднім на кожную групу прыходзіцца да 47 вучняў. Каб даць магчымасьць дзецям рабочых і служачых працягваць сваю адукацыю, гарсавет вырашыў адчыніць 4 новыя раўналежныя пятыя класы, з іх 2 за сродкі бацькоў.

АКРУГОВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ДРУКАРОЎ.

Гомель, 27. На 8-ае кастрычніка склікаецца акруговая канфэрэнцыя друкароў. У бліжэйшы час на калектывах будуць распачаты выбары дэлегатаў па модусу і дэлегат ад 20 членаў саюзу.

НА 125.000 РУБ. ЛЕСУ Ў КРЭДЫТ.

Магілеў, 26-9. На акругу адпушчана 125.000 руб. на водпуск лесу ў крэдыт сялянам. У мінулым жа годзе было адпушчана ўсяго на 60.000 руб. Разьмеркаваньне крэдыту па сельска-гаспадарчых таварыствах ужо зроблена, і сяляне змогуць у гэтым годзе своячасова яго атрымаць.

ЧЭХІЯ АБ ПРЫЕЗЬДЗЕ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ.

У Прагу прыехалі нашыя пісьменьнікі Янка Купала, Міхась Чарот і Міхась Зарэцкі.

У вялікай чэшскай штодзённай газэце „Рудэ Право“, (№ 220) з прычыны іх прыезду зьмешчаны вялікі артыкул пад назвою „БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТАРЫ Ў ПРАЗЕ“.

У артыкуле побач з біяграфічнымі матар'яламі даецца глыбокая характарыстыка творчасьці прыехаўшых пісьменьнікаў.

„Рудэ Право“ вельмі прыхільна адзначае багатыя дасягненьні нашай літаратуры.

Весткі адусюль.

Катастрофа ў Дарданэльскай пратоцы.

АНГОРА, 24-9. Анатолійскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе: «Учора ўночы ў Дарданэльскай пратоцы здарылася стычка двух нафтаналіўных суднаў над румынскім сьцягам—„Людовік Разік“ і „Барбон Стойн“. „Людовік Разік“ адразу-ж затануў; яго экіпаж яго выратаван камандаю судна „Барбон Стойн“, якое пасавана вельмі нязначна».

Суровыя прысуды за антымілітарысцкую агітацыю.

ПАРЫЖ, 24-9. Камуністы Удэн і Сорэ засуджаны да 4-хмесячнага зьняволеньня ў астрозе і штрафу ў 500 франкаў кожны за агалашэньне артыкулаў, у якіх суд убачыў падбухторваньне вайсковых служачых да непаслухмянасьці.

Аварыя нямецкага самалёту ў Пэрсіі.

ТЭГЕРАН, 25-IX. Вялікі пасажырскі аэраплян Юнкэрс, прыбыўшы з Бэрліну, пацярпеў аварыю. Пры зьніжэньні пасьля палёту з пасажырамі над горадам апарат паламаў крыло і пашкодзіў некаторыя іншыя часьці. З пасажыраў адзін лёгка паранены.

Спатканьне савецкіх матацыклістаў у Бэрліне.

БЭРЛІН, 23-IX. Савецкія матацыклісты, зварочваючыся з Парыжу ў Маскву, сёньня зноў прыбылі ў Бэрлін. Бэрлінскія рабочыя спартыўныя арганізацыі заклікаюць бэрлінскіх рабочых арганізоўваць дэманстрацыю спачуваньня ў зьвязку са стартам матацыклістаў у Маскву. (Старт назначан на сёньня).

РУМЫНІЯ НЕ ДАСТАЛА ПАЗЫКІ.

ВЕНА, 21-IX. У Бухарэст вярнуўся з заграні-нага падарожжа міністр фінансаў Братыяну.

Водлуг паведамленьня друку, падарожжа міністра фінансаў было прысьвечана, галоўным чынам, перамовам аб пазыцы для Румыніі. Апазіцыйныя газэты зазначаюць пры гэтым, што перамовы, якія Братыяну вёў з ангельскімі банкаўскімі коламі, пацярпелі няўдачу.

Менскі гарнізон на манэўрах.

УРАД БССР ВІТАЕ ЧАСЬЦІ МЕНСКАГА ГАРНІЗОНУ.—СТОЙКАСЬЦЬ І ТРЫВАЛАСЬЦЬ БАЙЦОУ—ЗАКЛАД БОЯЗДОЛЬНАСЬЦІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.—СЯЛЯНСТВА ПА-БРАТЭРСКУ СУСТРАКАЕ БАЙЦОУ.

УРАД БССР НА БАЯВЫХ ПАЗІЦЫЯХ.

(*Ад нашага спэцкора*).

26 верасьня ўрад БССР на чале з тав. Чарвяковым, Галаўзедам і другімі прадстаўнікамі цэнтральных органаў прысутнічалі на манэўрах Менскага гарнізону, на кавалерыйскім і пяхотным наглядальных пунктах. Пасьля гутаркі з сялянамі і чырвонаармейцамі, прадстаўнікі ўраду зьвярнуліся з наступнай адозваў да манэўруючых часьцей:

ДА МАНЭЎРУЮЧЫХ ЧАСЬЦЕЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Вітаем байцоў, камандзіраў і палітпрацаўнікоў удзельнічаў манэўраў. У сучасны момант, калі капіталістычныя дзяржавы ўзмоцнена рыхтуюцца да вайны супроць СССР, задача ўзмацненьня абароназдольнасьці сацыялістычнай бацькаўшчыны, задача ўзмацненьня ўзброенай сілы рэспублікі зьяўляецца найгалоўнай, першачарговай нашай задачай.

Агрэсіўны [illegible] пехі сацыялістычнага будаўніцтва ў [illegible] усё больш і больш падрываюць у [illegible] сусьветнай буржуазеі на п[illegible] савецкай улады, на магчымасьць [illegible] савецкіх рэспублікі свайму ўпливу.

Рэвалюцыйны рух у Кітаі, які падрывае магутнасьць імпэрыялістычных дзяржаў, рост калёніяльнага вызваленчага руху ў запрыгнечаных імпэрыялістамі калёніяльных краінах таксама ўзмацняе варожыя адносіны капіталістычных дзяржаў да СССР.

Варожасьць і злосьць капіталістычных дзяржаў супроць СССР расьце. Сусьветная буржуазея становіцца на шлях узброенай барацьбы з Савецкім Саюзам і ўзмоцнена рыхтуе сілы для нападу на першую ў сьвеце рабоча-сялянскую дзяржаву.

Стаючы перад пагрозай новай ваеннай небясьпекі Савецкаму Саюзу з боку капіталістычных дзяржаў, мы павінны ўжыць усе патугі, каб быць гатовымі даць грозны адпор ворагам СССР.

Манэўры Чырвонай арміі зьяўляюцца аднэй з фэрм вучобы і ўзмацненьня боязьдольнасьці Чырвонай арміі, Манэўры гэтага году адрозьніваюцца ад манэўраў мінулага году тым, што яны адыграюць аграмадную ролю ў справе ваенізацыі ўсяго насельніцтва. Назіраньне за ходам манэўраў рабочых і сялян удзел у манэўрах часьцей ТДА-Авіяхіму будзе мець вялікае значэньне ў падрыхтоўцы да вайны ўсяго насельніцтва. Ход манэўраў, якія праводзяцца зараз паказвае, што баявая вывучка байца стаіць досыць высока. Назіраньне за манэўрамі паказалі нам, што чырвонаармейскі склад хутка прыстасоўваецца да абставін, блізкіх к ваенным.

Неабходна адзначыць стойкасьць і трываласьць байцоў у абставінах манэўраў. Можна сказаць, што манэўры праходзяць надзвычайна добра. Пасьпешны ход манэўраў упэўнівае нас у тым, што часьці Чырвонай армії ў любы момант па заданьню савецкага ўраду і камуністычнай партыі будуць гатовы нанесьці сьмяротны ўдар ворагам Савецкай рэспублікі.

Старшыня ЦВК БССР **ЧАРВЯКОЎ.**
Старшыня СНК БССР **ГАЛАДЗЕД.**

У сучасны момант галоўпаліткіраўніцтва гэту адозву разаслала па часьцях і апавясьціла ўсяму складу манэўруючых часьцей.

Упэўненасьць ураду і прадстаўнікоў кампартыі часьці з гонарам выканаюць.

С. К.

У чым наша моц?

(*Ад нашага спэцкора*).

Раніца. Пасьля дажджлівай пачы ядрана. Полк выцягнуўся доўгай істужкай па абодвых бакох вуліцы. Чыр-цы пасьля добрага адпачынку бадзёрыя і іх праводзяць сотні вачэй сялян. Толькі выйшлі за вёску, як зьвіўся ў паветры самалёт «ворага». Цераз некалькі хвілін гэта ня была ўжо калёна, а рухаючыся лес, бо чыр-цы замаскіраваліся зеляньню.

Наводка палявога тэлефону.

Падыходзім у райён вёскі Курганы і застанавіліся на 52 хвілины ў лесе. Пад дрэвамі можна было ўбачыць групы чыр-цаў, якія сядзелі вакол чытачоў і слухалі аб справе з шпіёнамі-манархістамі, а чытачы лоўка пераходзяць ад чыткі да гутаркі аб вайсковай таемнасьці на манэўрах і аб сялянскіх пасевах, якіх нельга таптаць. Раптам падбягае хлапчук гадоў 15-16 і, выцягнуўшыся па вайсковаму, запытаў: «т. камандзір, ці будзеце мяне лаяць, калі я прынясу чыр-цам вады?» Я адказаў, што ня буду. Тады ўжо можна было ўбачыць грамадзянак, якія вёдрамі несьлі ваду чырцам, а чыр-цы напіўшыся ўважліва дзякавалі ім. У гэтым адчуваецца блізасьць паміж Чырвонай арміяй і насельніцтвам. Калісь-то ў гэтым райёне быў маёнтак Шпіпа, а цяпер красуюцца прыгожыя посёлкі і хутары на панскай зямлі—вось чым тлумачыцца спачуваньне нам з боку насельніцтва. Але ня толькі насельніцтва адносіцца добра да чыр-цаў, а і чыр-цы пасьля занятак дапамагаюць ім у працы на гаспадарцы.

Гэткая сувязь паміж Чырвонай арміяй і насельніцтвам, узаемная дапамога забясьпечваюць посьпех мірнага будаўніцтва.

Б. С.

Суткі на манэўрах.

(*Ад нашага спэцкора*)

Раніца. Полк выстраіўся квадратам вакол трыбуны на пляцу перад лягерамі. На трыбуне вайсковы камісар: «Мітынг, прысьвечаны адходу палка на манэўры, лічу адчыненым». Аркестр грае Інтэрнацыянал. Усе прамоўцы адзначылі значэньне манэўраў і напаміналі сучасныя міжнародныя абставіны.

У ПАХОДЗЕ.

Пасьля мітынгу полк, пад гукі аркестру, доўгаю істужкаю рушыўся ўперад. Музыка сьціхла. Песьні па ротах паліліся ракою. 40 хвілін прывал. Далёка ў небе паказаўся самалёт «ворага». Чырвонаармейцы шчыльна прыхіліліся да кустоў. Самалёт схаваўся. Пачаліся гутаркі на розныя тэмы, у другой групе чытка часопісаў, а трэцяя глядзіць, як чыр-ц танцуе і г. д.

Справа—тав. ЧАРВЯКОЎ, у сярэдзіне т. ГАЛАДЗЕД глядзіць праз падзорную трубу.

Стаявіс! Зноў ідуць далей і што крок, дык бліжэй да Юр'ева. Могілкі. А за імі дарога ідзе ўлева. Далёка паказалася чорная пляма і чатыры чырвоных штандары—гэта Юр'еўскія арганізацыі вышлі сустракаць наш полк. Няхай жыве Чырвоная армія! Ура!—нясецца ва ўсе бакі.

СПАТКАЛІ ПА-БРАТЭРСКУ.

Вёска, як відаць культурная, бо ў кожнай хаце парадак, вазоны, крэслы і г. д.

У вёсцы Юр'ева мы засталіся начаваць. Насельніцтва нас сустракала так, як сустракаюць сваю радню. Ніводзін селянін не адпёсься дрэнна да чырвонаармейцаў, а наадварот, усіх разьмясьцілі як належыць. Куды ў хату ні зойдеш, усюды ідуць гуткі паміж сялянамі і чырвонаармейцамі. Адзін дзед правёў гутарку, як ён служыў у старой арміі і як іх гапялі на «усмирение» сялян у вёскі Еськавічы і Дзяніскавічы, Нясьвіскай воласьці, Навагрудзкага павету. Чырвонаармейцы яго ўважліва слухалі, бо дзед Шэвель расказваў добра, як быццам паліткіраўнік.

Пасьля адпачынку ў некаторых ротах была арганізавана калектыўная дапамога сялянству. Так, у бядняка—Шэвеля Янкі чырвонаармейцы змалацілі і з'арахавалі 15—20 пудоў аўса, другім сялянам дапамагалі ссыпаць бульбу і інш.

Змрок. Зайграла музыка. Чырвонаармейцы і грамадзяне пацягнуліся на пляц, дзе было прымайстравана палатно для кіно. Была пастаўлена карціна «Красные дьяволята» на адкрытым паветры.

Гутаркі, узаемная дапамога, добрая сустрэча з боку сялянства сьведчыць аб тым, што Чырвоная армія—гэта ня царская армія, пра якую тлумачыў стары дзед Шэвель чырвонармейцам, якая душыла сялян, а армія, якая абараняе інтарэсы працоўных. Гэта сувязь, якая існуе паміж Чырвонай арміяй і сялянствам робіць яе боязьдольнай і непераможнай.

Б. Ч.

№ *Чырвонаштандарны полк.*

„Прыфрантовая паласа“.

(З запісной кніжкі карэспандэнта).

Сыпле дробны і нудны дождж. Здаецца, што гэта ня дождж, а атрамант, які заліває паверхню зямлі. Шэрая і нязначная нават у дзень станцыя № патапула ў чорнай імжы.

Раскінутыя ў пацёмках маленькія хаткі чакаюць гасьцей. На брамах ледзь бачныя знакі крэйдаю:

— 6 чалавек, 3 чал.

Гэта кватэр'еры падрыхтавалі падыходзячым людзям кватэры.

Ужо наладжана сувязь. У маленькай халупцы, дзе разьмясьцілася тэлеграфная варта, горача. Патаемна ляпае «марэанка». Гудзе палявы тэлефон, выклікае пост Н.

Прыцихлі. У пацёмках нарастаюць гукі. Яны набліжаюцца, растуць. З ночы выплываюць два падсьлепаватыя вокі вайсковага эшалёну. З хрыпам гучыць сьвісток цягніка, эшалён груза спыняецца перад пляцформаю.

Саскочыў начальнік эшалону, адрапартаваў начальніку дывізіі. Потым па вагонах ціхая команда:

— Падрыхтуйся да выгрузкі. Кулямётнай роце падрыхтавацца да абароны ад паветранага нападу.

Сыгнал. На пляцформе замільгацелі цені. Выстраіліся. Часамі зьвякне маперка ды прагрукаціць коламі «максім». І ізноў ціш. Эшалён выгрузіўся. №-скі полк пастроіўся ў паходную калёну. Каманда.

Ноч праглынула полк, а багна заглушыла выразныя крокі і людзі нібы расталі...

ПЕРАД НОВЫМІ БАЯМІ.

Дождж, дождж і дождж. Здаецца, штабу галоўнага кіраўніцтва прыбыў матацыкліст. Машына ўся заплявана гразьзю. Праз хвіліну ён, моцна вылаяўшыся па адрасу «убійсьцьвеннай» дарогі, набіў трубку махоркай і ізноў шчэз са штабу.

У штабе дзелавая суматоха. Усе падначалена аднэй дырэктыве, ідучай са штабу галоўнага кіраўніцтва. Грукоча артылерыя. Сапёрныя часткі, атрымаўшы заданьне, скрываюцца за паваротам дарогі. Унеслася конная разьведка. Усё маскіруецца: коні, фурманкі, гарматы...

У часьцях і сярод вакольнага насельніцтва праводзіцца палітработа. Часьці выпусьцілі свае газэты. У газэтах абгаварваюцца міжнародныя пытаньні, сучасныя манэўры і ня менш важнае пытаньне—як захаваць у часе паходу сухімі анучы

Гэткая сапраўднасьць. Сухія анучы—здароўе байца, а, значыць, і парука яго баяздольнасьці.

Настрой часьцей бадзёры. Бадай, нават і кепскае надвор'е іспытвае чырвонаармейцаў: што, моў, таварышы, калі сопейка, ды суха, манэўраваць хоць бы хны. А вось папрабуйце выканаць баявыя задачы ў гэткую гразь. Трэба загартоўваць сябе, прывыкаць да ўсіх магчымых непрыемнасьцей паходнага жыцьця.

Гэта ўлічвае і чырвонаармейская маса.

— Нічога, прывыкнем! Бяз гэтага не абыйдзешся—кажуць пераменьнікі і кадравікі.

Сёньня зьнімаемся і пераходзім на перадавыя пазіцыі.

Будучына коньніцы.

(З францускіх манэўраў).

У часе імпэрыялістычнае вайны, калі пачалася пазіцыйная нерухомасьць і шматмільённыя арміі назарываліся ў зямлю, як краты,—здавалася, што ваенная роля коньніцы скончылася назаўсёды. На францускім фронце ўжо ў 1914 г. пасьля бітвы пад Марнаю, а на расейска-нямецкім фронце пасьля вялікага адходу 1915 г. коньніца заставалася ў вымушанай бясчыннасьці. Пасьвядчаны бой—галоўны сэнс існаваньня коньніцы на ранейшых разуменьнях—пры пазіцыйнай вайне стаўся немагчымым. Коньніца абярнулася ў вялікага калектыўнага дармаеда. На расейска-нямецкім фронце значэньне коньніцы заставалася ўсё яшчэ большым, чым на французка-нямецкім. Пазіцыйная ўстойлівасьць расейска-нямецкага фронту была непараўнана меншая, чым францускана-нямецкага. Заўсёды трэба было ўлічваць магчымасьці прарыву і пераходу (хадзя-бы часовага) ад пазіцыйнае да манэўравае вайны. Коньніца трымалася на запас.

Апрача таго, пры дрэнных сродках сувязі, конная сувязь служыла добрым дапаўненьнем у гэтых адносінах. Калі пачалася рэвалюцыя і бунты пяхотных часьцей, коньніца, як больш рэакцыйная, ужывалася дзеля падаўленьня бунтаў і расфармаваньня збунтаваных. Пры нераглядзе вайсковых дакумантаў расейскае арміі за 1917 г., гэтая роля коньніцы выступае надта яскрава.

На Захадзе-ж да масавых салдацкіх бунтаў не дайшло, сродкі сувязі былі [illegible] і калічнасьць масы самаходаў і матацыклетаў рабіла коньніцу непатрэбнаю і дзеля паладжаньня сувязі.

У выніку ўсяго гэтага сярод ваенных тэарэтыкаў і практыкаў, асабліва на захадзе, стала панаваць перакананьне, што коньніца аджыла свой век і павінна сыйсьці са сцэны. Праўда, канец вайны калі сказьвіў абдзі нямецкі фронт і пагвалі нямецкую армію перад сабою, абярталючы ізноў пазіцыйную вайну ў манэўравую, як бы стварыў надставы дзеля перагляду пытаньня аб коньніцы.

Атрутныя матэрыі і танкі зьявіліся грозьнымі і магутнымі ворагамі нярухомае пазіцыі. Але перакананьне аб малым значэньні коньніцы ня ўзрушыла. Грамадзянская вайна на абшарах Савецкага Саюзу з яе адсутнасьцю сталых фронтаў і надзвычайнай рухомасьцю зьявілася першым пераглядам пытаньня аб ролі коньніцы на карысьць апошняе. Далей прыйшоў 1920 год, паход на Варшаву і адход ад яе.

У сваёй кніжцы „1920 год“ Пілсудзкі прызнаецца, што калі коньніца Будзёнага прарвалася на тылы 1-ае польскае арміі (Рыдз-Сьміглага), займаўшае Кіеў,—дык ён не адразу зразумеў усю грознасьць гэтага факту і спачатку „лекцэважыў“ яго, дзівячыся толькі ды злуючыся, чаму ліквідацыя гэтае коньніцы зацягнулася. Ён усё яшчэ знаходзіўся пад уплывам „навейшых“ заходніх поглядаў на ролю коньніцы. Аднак далейшыя апэрацыі Будзёнаўскае коньніцы паказалі Пілсудзкаму і іншым, што яе „лекцэважыць“ ня прыходзіцца, што яна зьяўляецца паважным і небясьпечным праціўнікам.

Пасьля 1920 году (галоўным чынам, пад уплывам апэрацый Будзёнаўскае коньніцы) пачала прымячацца і на Захадзе цікавасьць да ролі коньніцы ў сучаснай вайне, пачаў прымячацца паварот у адносінах яе значэньня. Як далёка зайшоў гэты працэс,—паказваюць гэтагоднія францускія манэўры ў Лётарынгіі, якія мелі сваёю спэцыяльнаю мэтаю практычнае вывучэньне ролі коньніцы ў сучаснай вайне. Цяпер, калі на абшарах Савецкае Беларусі адбываюцца манэўры Чырвонае арміі,—абзнаямленьне з ходам і вынікамі францускіх манэўраў можа аказацца вельмі своячасовым цікавым таксама дзеля савецкага чытача.

У францускіх манэўрах прыймалі ўдзел «чырвоныя» і «сінія». На старане «чырвоных» выступала нармальная француская дывізія коньніцы з 6 палкоў (8, 28, 30 і 31 драгунскія і 3 і 8 гусарскія палкі), дывізіён самакатчыкаў, дывізіён бранявых самаходаў і дывізіён конае артылерыі. У часе манэўраў дывізія была яшчэ ўзмоцнена палком пяхоты, дывізіёнам 75 м. м. артылерыі, перавезенае на самаходах і гэткім-жа дывізіёнам 155 м. м. Кіраваў „чырвонымі“ ген. Тійён (Tillion), камандзір 3-га кавалерыйскага згуртаваньня ў Люнэвілі.

На старане „сініх“ (праціўніка) выступала брыгада коньніцы (3 драгунскі полк і Пары (Paris), камандзіра 1-га кавалерыйскага згуртаваньня ў Пансі.

Агульным кіраўніком манэўраў быў вядомы

Што няясна ў справе землянадзяленьня

(У парадку абгавораньня).

Матар'ялы па вучоту зямель запаснага фонду і безь зямельных і малазямельных грамадзян гаворадь нам аб вялікай нястачы зямлі дзеля задаволеньня ўсіх земляробскіх гаспадарак нават па той «галоднай» норме, якая ўстаноўлена Наркамземам. Зямельны голад у нас па Беларусі адчуваецца нават і бяз лічбовых даных, характарызуючых яго разьмеры. Работы па адшуканьню запаснага зямельнага фонду і надзяленьню з яго безьзямельных і малазямельных гр-н ужо ў працягу трэцяга году вядуцца дзеля таго, каб зьменшыць па меры магчымасьці зямельны голад.

Але ў апошнія часы па мясцох здараецца цікавае зьявішча: ёсьць зямля, ды няма каму яе даваць, няма жадаючых. Вось некалькі канкрэтных прыкладаў, якія мы можам прывесьці па памяці.

1) У хутары Пажэжына, Койданаўскага райёну, праведзена падрыхтоўка па абрэзцы гаспадарак і разьмеркаваньні запаснага фонду. У выніку падрыхтоўкі выявілася, што каля 45-ці дзесяцін зямлі няма каму разьмяркоўваць, іх пакідаюць у запасным фондзе.

2) У хутары Ляшчына-Фэліксава Астрашыцка-Гарадзецкага райёну таксама земляўпарадчык ня ведае, куды дзець 30 гэктараў зямлі, што абразуюцца ад гаспадарак, маючых звыш максымальнай нормы, бо ні сельсавет, ні РВК ня могуць знайсьці кандыдатаў па надзяленьне.

3) Падобнае гэтаму стваравецца становішча і ў в. Малінаўка, Астрашыцка-Гарадзецкага райёну, дзе засьценак П. Малінаўка ўключан у абавязковым парадку ў дачу разьмеркаваньня, абрэзана яго землякарыстаньне, а цяпер ніхто ня хоча браць гэтыя «абрэзкі». Па гэтай-жа вёсцы, у мэтах разьмеркаваньня наяўнага запаснага фонду, «мінімальная» норма даведзена да 15-17 гэктараў на гаспадарку, пад выглядам «расцёнкі» зямель.

Стваравецца цікавае становішча, калі ў адной з акругаў, з найбольшым зямельным дэфіцытам, няма куды дзець зямлю.

У прыведзеных выпадках на х. х. Пажэжына і Ляшчына-Фэліксава частка зямель ужо была абрэзана сельсаветамі ў мінулыя гады і на абрэзках гэтых ужо насяліліся альбо так закарысталіся гр-не, якія цяпер просяць, каб іх канчаткова ўпарадкавалі. Адначасова з гэтым і «абрэзаныя» гаспадаркі зацікаўлены ў канчатковым вызначэньні іх межаў і разьмераў землякарыстаньня. Мы згаджаемся, што імкненьні адных і другіх трэба задаволіць, але што-ж рабіць з рэштай зямлі, якая перавышае і максымальныя нормы аднаго і мінімальныя нормы другога?

Абсежнік НКЗема № 18—1926 г. забараняе вытвараць абрэзку ў тых выпадках, калі зямля, што пералічваецца ў запасны фонд з буйнай гаспадаркі, зараз-жа не разьмяркоўваецца малазямезным і беззямельным Пакідаць зямлю ў далейшае карыстаньне тэй гаспадаркі, ад якой яе адрэзалі, ці даваць звыш нормы «мінімальнікам»? У першым выпадку—замаўоўваць зусім, ці пакідаць часова? Калі пакідаць часова, дык дакуль лічыць гэту «часовасьць», тым больш, што зямельны кодэкс наогул не прадугледжвае часовага карыстаньня зямлёю. Цікава было-б, каб па гэтаму пытаньню выказаліся работнікі райёнаў і сельсаветаў—якая іх думка?

К.

Скарыстаньне торфу захавае нашы лясы

ДЗЕ АРГАНІЗУЮЦЦА ТОРФАРАСПРАЦОЎКІ.

Таварыства «Белторф» прыступае сёлета да пабудовы пасёлкаў на торфяных балотах каля Барысава і Бабруйска. У гэтых гарадох сканцэнтравана прамысловасьць ВСНГБ, і ёсьць поўны сэнс распачаць там распрацоўкі торфу.

«Белторф» тэрмінова робіць падрыхтоўку да арганізацыі торфараспрацовак у 3 мясцох: «Белае Балота (8 кілёмэтраў ад Барысава), «Шчораш-Пацярэбы» (5 кілём. ад Бабруйска) і «Масюкоўшчына» (7 кілём. ад Менску).

ЦІ ВАРТА ЗДАБЫВАЦЬ ТОРФ КАЛЯ БАРЫСАВА.

Агульная патрэба ў апале прадпрыемстваў ВСНГ у Барысаве дасягае 10 тысяч кубічных сажняў дроў у год. Кошт кубічнага сажня дроў на чыгуначнай станцыі ці на прыстані—43 р., а з дастаўкай на завод—у сярэднім 45 руб. за куб. саж.

Каб замяніць пакуль што хоць часткова дрываны апал тарфяным на заводах ВСНГ у Барысаве, «Белторф» прыступіў да арганізацыі распрацовак на «Белым Балоце». Плошча гэтага балота займае 300 гэктараў з запасам сухога торфу каля 150.000 куб. саж. Сажань торфу дае шмат больш цяпла, чымся сажань самых добрых дроў. На балоце торф будзе каштаваць 34 руб. за куб. саж. Дастаўка да заводу абыдзецца ня болей 10 руб. за сажань.

Адсюль відаць, што здабываць торф на «Белым Балоце» трэба: абыйдзецца таньней, будзе больш цяпла і ня трэба будзе вырубваць лес, якога ў нас мала.

АРГАНІЗАЦЫЯ РАСПРАЦОЎКІ КАЛЯ БАРЫСАВА.

Сёлета зімою каля «Белага Балота» распачнецца пабудоўка пасёлка. Будуць пабудаваны баракі для рабочых, дамы для сталага пэрсаналу распрацовак, сталоўка, лазьня, кузьня, кухня і г. д. Такі-ж пасёлак будзе пабудован і каля Бабруйску.

На гэту справу ўжо ёсьць сродкі ў суме каля 500.000 руб..

ЗДАБЫЧА ТОРФУ І КВАЛІФІКАЦЫЯ РАБОЧЫХ.

За 1927-28 год «Белторф» мяркуе здабыць 2.800.000 пуд. сухога торфу. З гэтай колькасьці 1.900.000 пудоў будзе здабыта машынамі, а рэшта—ручным спосабам. Ручны спосаб здабываньня торфу астаўляецца наўмысьля, бо ў БССР няма сваіх рабочых, умеючых працаваць на машынах. Працуючы ручным спосабам побач з машынамі, рабочыя будуць набываць кваліфікацыю і з часам мы будзем мець сваіх рабочых.

БАБРУЙСКІ ТОРФ САМЫ ТАНЬНЫ.

Амаль такія-ж прадпасылкі для здабываньня торфу і ў Бабруйшчыне, з тэй толькі розьніцай, што там ён будзе каштаваць таньней, бо дастаўка яго лягчэйшая.

Масывы як у Барысаве, так і ў Бабруйску маюць запас прыблізна на 20 год.

Ужываньне на бабруйскіх заводах торфу за год дасьць эканомію ў 30.000 руб.

За 1927-28 год «Белторф» мае здабыць торфу на 352.000 руб. Амаль 70 проц. гэтай сумы пойдзе на зарплату рабочым, што часткова дапаможа зьнішчыць беспрацоўе.

Ашчаднасьць—на індустрыялізацыю краіны.

ПАДПІСКАЙ НА ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ МЫ ПАВЯЛІЧЫМ МАГУТНАСЬЦЬ НАШАЕ ГАСПАДАРКІ.

КОЖНЫ ПАВІНЕН СТАЦЬ УКЛАДЧЫКАМ КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ.

Больш увагі справе ашчаднасьці.

ДВУХТЫДНЁВІК—МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎВАГІ ДА СПРАВЫ АШЧАДНАСЬЦІ.

1-га кастрычніка канчаецца «двухтыднёвік ашчаднасьці». Мы яшчэ пакуль што ня маем дакладных зьвестак аб рэзультатах двухтыднёвіка, асабліва з вёскі, але відавочна адно, што гэта кампанія зрабіла вялікі зьдвіг у бок мабілізацыі ўвагі да справы ашчаднасьці і дала станоўчыя вынікі ў сэнсе ўкладаў сваіх зьберажэньняў у касы ашчаднасьці насельніцтвам гораду і вёскі.

У гэтыя дні з асаблівай выразнасьцю мы павінны былі паставіць перад сабой задачу максымальнай ашчаднасьці ў выдатках сродкаў і прыцягненьня ўсякага роду зьберажэньняў дзеля накіраваньня іх у дзяржаўныя ашчадныя касы і ў крэдытна-каапэрацыйныя таварыствы. Значэньне і сэнс ажыцьцяўленьня ашчаднасьці заключаецца першна-перш у тым, што патрэбы нашай гаспадаркі вымагаюць выключнага напружаньня ўсіх сіл, якія могуць дапамагаць разьвіцьцю і ўзмацненьню гаспадаркі Саюзу.

Перажываемы пэрыяд гаспадарчага будаўніцтва ў нашай краіне ва ўсіх галінах гаспадаркі патрабуе значных капітальных уражэньняў, пры дапамозе якіх можна было-б, з аднаго боку, узмацніць тэмп разгортваньня нашай буйнай прамысловасьці, а з другога—узмацніць і разьвіць сялянскую гаспадарку і зьвязаныя з ёй промыслы.

Вязумоўна, што нашы дасягненьні як у разгортваньні буйнай прамысловасьці, гэтак і ў галіне сельскай гаспадаркі адзначаюць нашы посьпехі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва гаспадаркі, пры адначасовым павышэньні ўзроўню дабрабыту шырокіх мас рабочых і сялян.

УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ ЎЗМАЦНЯЮЦЬ НАШЫ ПАЗІЦЫІ ВА ЎЗАЕМААДНОСІНАХ З КАПІТАЛІСТЫЧНЫМІ КРАІНАМІ.

Трэба мець таксама на ўвазе, што скарыстаньне нашых унутраных рэсурсаў, у чым бы яны ні заключаліся, у тым ліку і рэсурсаў ад дробных зьберажэньняў, у значнай меры ўзмацняе нашы пазіцыі ў гаспадарчых узаемадносінах з капіталістычнымі краінамі. У адказ на розьнага роду імкненьні з боку капіталістых зрабіць гаспадарчы нажык па Савецкі Саюз мы, таксама як і па лініі ваеннай абароны, павінны адказаць максымальнай падрыхтоўкай уласных сіл для разьвіцьця нашага гаспадарчага будаўніцтва цоўных ашчадных кас і крэдытна-каапэрацыйных т-ваў. Гэты апарат кожнаму грамадзяніну дае магчымасьць укладзіці свае зьберажэньні ў ашчадную касу ці крэдытна-каапэрацыйнае т-ва і гэтым шляхам накіраваць іх на ўзмацненьне нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

МАТАР'ЯЛЬНЫЯ ВЫГАДЫ ДЛЯ ЎКЛАДЧЫКАЎ У КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ.

Само ўлажэньне зьберажэньняў у ашчадныя касы і ў крэдытныя каапэратывы павінна матар'яльна зацікавіць укладчыка, які на ўкладзеныя грошы атрымлівае процанты і зусім гарантаваны ад усякіх страт і нявытворчых выдаткаў, што бывае часам, калі зьберажэньні захоўваюцца дома.

Неабходна адзначыць, што па пастанове ЦВК і СНК Саюзу ад 31-га жніўня г. г. (Изв. ЦИК СССР от 3-IX—27 г. № 201) ільготы, якія прымяняліся да ўкладчыкаў працоўных ашчадных кас, распаўсюджваюцца цяпер таксама і на ўкладчыкаў у крэдытна-каапэрацыйныя т-вы.

Крэдытна-каапэрацыйныя т-вы, якія зьвязаны ў гаспадарчай працы з масамі пераважна вясковага насельніцтва, пастаўлены перад вялікай задачай мабілізаваць дробныя зьберажэньні ў сельскіх мясцовасьцях і гэтыя зьберажэньні накіраваць на ўзмацненьне сродкаў гаспадаркі краю. Трэба ўтварыць такія абставіны, пры якіх дробны ўкладчык са сваімі працоўнымі зьберажэньнямі лёгка прасякаў-бы ў касы т-ва і меў бы гарантыю гэткай жа лёгкасьці і даступнасьці кас у тых выпадках, калі ўкладчык будзе мець патрэбу атрымаць грошы з крэдытна-каапэрацыйнага т-ва.

Згодна апошніх балянсавых даных пачатковай сеткі сыстэмы с.-г. крэдыту, па БССР ва ўклады ўцягнута 390,6 тыс. руб., ці 3,8 проц. у адносінах да балянсу.

Неабходна адзначыць, што рост укладаў за апошні час ідзе, галоўным чынам, за лік уцягненьня сродкаў мясцовых гаспадарчых і савецкіх арганізацый і ўстаноў.

Капчаючы працу па правядзеньні двухтыднёвіка ашчаднасьці, мы павінны, не паслабляючы тэмпу, рашуча перайсьці да сталай працы па прыцягненьні ўкладаў у горадзе і асабліва ў вёсцы, дзе нізавая сетка сыстэмы с.-г. крэдыту, цесна зьвязаная ў гаспадарчых адносінах з сялянскай масай, павінна ўзмацніць сваю працу па прыцягненьні сялянскіх укладаў на ўзмацненьне рэсурсаў сацыялістычнага будаўніцтва.

А. Дубіна

УСЕ ПРЫМЕМ УДЗЕЛ У ФІНАНСАВАЙ САМААБАРОНЕ.

На агульным сходзе рабочых фабрыкі «Восход» прысутнічае да 100 чалавек. Даклад аб значэньні 2-хтыднёвіка ашчаднасьці і аб пазыцы індустрыялізацыі спрэчак ня выклікаў.

— Што там многа гаворыць? Усім нам відавочна карысьць кас ашчаднасьці як для рабочых, так і для дзяржавы,—кажа рабочы т. С.—стары ўкладчык касы.

Сход рабочых вырашыў, каб усім прыняць удзел у фінансавай абароне краіны.

— Усе будзем укладчыкамі кас ашчаднасьці,—сказалі рабочыя і даручылі мясцкому арганізаваць калектыўную падпіску на пазыку індустрыялізацыі.

ПЭНСІЮ БУДЗЕМ АТРЫМЛІВАЦЬ ПРАЗ КАСУ АШЧАДНАСЬЦІ.

На сходзе працаўнікоў усіх менскіх белларкоў, пасьля дакладу аб 2-тыднёвіку ашчаднасьці і пазыцы індустрыялізацыі, асабліва цікавіліся пытаньнем тэхнікі выплаты зарплаты праз касу ашчаднасьці.

У спрэчках выступаўшыя таварышы адзначалі ўсю выгаду ад хаваньня зарплаты ў касе.

— Мы,—заявілі прысутныя,—такім чынам, забіваем двох зайцоў: паляпшаем сваё становішча, бо прывучымся рацыянальна расходаваць грошы, а з другога боку—дапаможам гаспадарчаму будаўніцтву краіны.

Сход пастанавіў з 1 кастрычніка атрымліваць усім пэнсію праз касу ашчаднасьці і вылучыў камісію для правядзеньня калектыўнай падпіскі на пазыку індустрыялізацыі.

ЖАНЧЫНЫ ТАКСАМА НЕ АДСТАЮЦЬ.

Калектыў работніц «Дому Дзіцяці», у ліку да 100 асоб, вылучыў дэлегатку, якой даручана дагаварыцца з касай ашчаднасьці аб уступленьні ўсім работніцам укладчыкамі. Гэта дэлегатка, для выгады работніц, па іх расьніках будзе атрымоўваць грошы з касы, а таксама і класьці іх у касу.

ПАСТАНАВІЛІ КАЛЕКТЫЎНА ПАДПІСАЦЦА НА ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Працаўнікі Хлебапрадукту пасьля заслуханьня дакладу аб значэньні 2 тыднёвіка ашчаднасьці і пазыкі індустрыялізацыі, вылучылі ўпаўнаважанага для правядзеньня як падпіскі на пазыку, так і афарміленьня ўкладаў у касу ашчаднасьці.

ВІЦЕБСК.

Па нявоўных вестках, за першы тыдзень кампаніі ашчаднасьці, лік укладчыкаў у горадзе пазялічыўся на 189, якімі паложана ў касы ашчаднасьці 30.802 руб. Рабочыя і служачыя на многіх сходах выказваюць жаданьне набыць акцыі.

МАГІЛЕЎШЧЫНА.

У Касьцюковіцкім раёне за першыя 7 дзён кампаніі ўцягнута 60 новых укладчыкаў з 1868 руб. укладу. У Бялыніцкім раёне за 2 дні кампаніі ашчаднасьці ўступілі 22 новыя ўкладчыкі, з іх палова сялян.

ГОМЕЛЬ.

Кампанія ашчаднасьці разгортваецца ня толькі ў горадзе, а і на вёсках. У Гомелі на шэрагу прадпрыемстваў праведзены даклады аб значэньні 2-хтыднёвіка ашчаднасьці. Асабліва вялікую працу разгарнула прыцісная каса сяніковай фабр. „Везувій": першыя дні кампаніі на ёй далі 50 новых укладчыкаў.

Вясковыя каапэрац. працаўнікі—аб пазыцы індустрыялізацыі.

На нарадзе прадстаўнікоў вясковай каапэрацыі Менскай акругі, якая адбылася пры Белкаапсаюзе, вынесена пастанова аб правядзеньні на мясцох агульных сходаў пайшчыкаў-сялян для растлумачэньня важнасьці ўзмацненьня фінансавай абароны Саюзу.

Пастаноўлена таксама павесьці працу па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі сярод пайшчыкаў.

Нарада абавязала кожнага члена праўленьня спаж. т-ва разьмясьціць гэтую пазыку сярод 10—20 сялян. На мясцох праўленьні вясковых спажывецкіх таварыстваў правядуць падпіску на пазыку індустрыялізацыі сярод сваіх працаўнікоў і членаў праўленьняў. Інструктарам Белкаапсаюзу даручана пры паездках правяраць, як праводзяцца мерапрыемствы ў справе распаўсюджваньня пазыкі індустрыялізацыі.

Перад юбілеем Кастрычніка

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК БССР

аб падрыхтоўцы да сьвяткаваньня X Кастрычніка.

Заслухаўшы даклад Цэнтральнай Камісіі па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць, што разгортваньне арганізацыйнай асабліва агітацыйна-масавай падрыхтоўкі да сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі яўна спазьняецца, у зьвязку з чым зьвярнуць выключную ўвагу ўсіх устаноў і грамадзкіх арганізацый на неабходнасьць праверкі выкананьня дырэктыў, даных Цэнтральнай Камісіяй, а таксама і становішча ўсёй падрыхтоўчай працы.

2. Запрапанаваць усім акруговым і раённым выканаўчым камітэтам узмацніць кіраўніцтва падрыхтоўчай працай да сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі і не пазьней 15-га кастрычніка заслухаць даклады адпаведных юбілейных камісій аб праробленай працы з пункту погляду ўзгодненасьці падрыхтоўчай працы з дырэктывамі Цэнтральнае Камісіі і ўцягненьня шырокіх мас рабочых і сялян да арганізаванага ўдзелу ў сьвяткаваньні.

3. Прызнаць неабходным больш шырокае асьвятленьне ў друку работы мясцовых юбілейных камісій, савецкіх, прафсаюзных і іншых грамадзкіх арганізацый па падрыхтоўцы сьвята, прыцягваючы праз друк да абгаварэньня і ацэнкі мерапрыемстваў у гэтай галіне шырокія масы рабочых і сялян.

4. Даручыць Цэнтральнай Камісіі:

а) арганізаваць папулярызацыю юбілейнай літаратуры, якая выдаецца ў БССР, а таксама і ў СССР у бібліяграфічных аддзелах газэты;

б) даць указаньні мясцовым камісіям аб скарыстаньні зьездаў работніц і сялянак, зьездаў прафсаюзаў, каапэрацыі, „дню ураджаю" і ўсіх іншых правадзімых кампаній для асьвятленьня значэньня вынікаў Кастрычнікавае рэвалюцыі;

в) праверыць выкананьне плянаў цэнтральных ведамстваў і арганізацый па падрыхтоўцы сьвята Кастрычнікавае рэвалюцыі і ўзмацніць сваё кіраўніцтва ўсёй гэтай работай;

г) зьвярнуць увагу на неабходнасьць увязкі пляну Чырвонай арміі з агульным плянам па падрыхтоўцы сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі;

5. Абавязаць усе цэнтральныя установы і акруговыя выканаўчыя камітэты зьбіраць літаратуру, зьвязаную з падрыхтоўкай да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі (сьценгазэты, пастановы, запісы і г. д.) і пасылаць гэтакую цэнтральнай камісіі па падрыхтоўцы сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

6. Заслухаць на бліжэйшым пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК даклад Цэнтральнай Камісіі аб нацыянальных момантах у дні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

З чым сустрэнуць сьвята беларускія фабрыкі і заводы.

* * *

Да дню Кастрычнікавай урачыстасьці на **2-й менскай гарбарні**, па праэкту, які зложан самімі рабочымі, будзе абсталёвана мэханічная (канверная) падача глянцаваных скур у сушню.

* * *

На папяровай фабрыцы **«Герой Труда» ў Добрушы** ў сьвята будзе адчынен новы інтэрнат для рабочых гэтай фабрыкі.

* * *

На папяровай фабрыцы **«Спартак» у Шклове** адчыніцца новая лазьня, якая абсталёвана па апошняму слову тэхнікі.

* * *

Шпалерная фабрыка імя «Вароўскага» ў Менску, па пастанове рабочых фабрыкі, перайменоўваецца ў фабрыку «Чырвоны Кастрычнік». Назва фабрыкі імя „Вароўскага", па папэртрэсту, застаецца ў Сураскай ф-кі.

* * *

Фабрыка **«Меншвэй»** пашыраецца праз прыняцьце ў яе 100 рабочых з працкалектыву. Новы будынак для гэтай фабрыкі будзе ў дні сьвята закладзен на Нова-Маскоўскай вуліцы ў Менску.

* * *

Па заводах **„Варшавянка" і „Пралетары"** ў дні 10-й гадавіны будуць адчынены новыя клюбы для рабочых гэтых заводаў.

* * *

На шкляным заводзе **«Камінтэрн» у Бабруйшчыне** да сьвята будзе закончана пабудова і абсталяваньне новай лазьні.

* * *

На **Асінстроі** адбудзецца адчыненьне рабочага пасёлку ў вёсцы Выдрыца.

* * *

На махорачнай фабрыцы ў Віцебску будзе пушчана ў ход лесапілка, дзе маюць выраблядца дошкі для махорачных скрынак.

* * *

Пры віцебскіх льнапрадных фабрыках канчаецца пабудова рабочага пасёлку і клюбу. Да сьвята закончыцца поўнае іх абсталяваньне.

* * *

48 кватэр для рабочых будзе закончана да сьвята.

З гэтага ліку 18 кватэр для рабочых заводу «Дрэваапрацоўнік" у Менску і 30 кватэр пры заводзе «Лесбела» ў Мазыры. Апроч гэтага, у Мазыры будзе зроблена закладка рабочага клюбу, які мае будавацца на сродкі трэсту.

* * *

У Менску **пры цагельні ў Тучынцы** адчыняецца 7 кватэр і клюб для рабочых гэтай цагельні.

* * *

На сяніковай фабрыцы **«Чырвоная Барэзіна»** ў Нова-Барысаве адчыняецца панова адрамантаваны інтэрнат, у які будзе зроблена праводка электрычнасьці.

* * *

У Рэчыцы пры камбінаце мэталётрэсту **будзе пушчана квасільнае аддзяленьне** пасьля капітальнага рамонту і пераабсталяваньня,

Пасяджэньне цэнтральн. юбілейнай камісіі.

26-га верасьня адбылося пасяджэньне Цэнтральнай Юбілейнай Камісіі па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя Кастрычніка. Былі заслуханы даклады ЦК ЛКСМ, НК Сацыяльнае Забясьпечэньня і НК Аховы Здароў'я.

Што робіць камсамол.

Камсамол БССР шырока разгарнуў працу па падрыхтоўцы да сьвята Кастрычніка. На месцы пасланы распрацаваныя пляны: 15—17 кастрычніка будуць скліканы масавыя канфэрэнцыі рабочай моладзі, г. 20-га кастрычніка такія-ж сходы сялянскае моладзі. Канфэрэнцыі і сходы ставяць сваёй задачай шырокае ўцягненьне ў падрыхтоўку да сьвяткаваньня Кастрычніка рабоча-сялянскай моладзі.

Акруговым камісіям запрапанавана звярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў сьвяткаваньне Кастрычніка польскай і латыскай моладзі.

Юбілейная камісія зазначыла, што камсамол усебакова разгортвае працу па падрыхтоўцы і лічыць яго пляны здавальняючымі.

АНАТОЛЬ ВОЛЬНЫ.

Антон Савіцкі*).

(Аповесьць).

Паліцыя шукае вядомага рабаўніка Савіцкага. Савіцкі рыхтуе напад на абшарнікаў Сівагорава і Ямбржыцкага, якія на паляваньні нібы нясумысьля забілі селяніна Загонава. Невядома дзе зьнікае абшарнік Ямбржыцкі. Сівагораў едзе ў горад за дапамогаю тайнай паліцыі. Разам з ім у купэ, як выявілася, едзе старшыня дзяржаўнай нарады Акімаў, які, даведаўшыся аб злачынствах Савіцкага, абяцае дапамогу з Пецярбургу. Тайная паліцыя дзейнічае ў сваю чаргу. Савіцкі са сваім найбліжэйшым сябрам Рыгорам ідуць „у рукі паліцыі". „Баль" у Сівагорава. Губарнатарская нарада. Савіцкі ў Сівагорава. Бойка з паліцыяй. Чалавек з Пецярбургу. Нарада тэрарыстаў. Савіцкі вучыць быць непакорнымі. Спатканьне Савіцкага і чалавека з Пецярбургу.

XXIV.

— Я вельмі рад вас бачыць!—сказаў пецярбуржац Савіцкаму.—Я шмат чуў аб вас...

Савіцкі слухаў словы пецярбуржца і ня чуў іх. У яго думках усё яшчэ жыў сказ Зіны: «Сюды прыехаў нейкі чалавек з Пецярбургу, які ўзьвядзе вас на шыбеніцу».

— Што вам ад мяне трэба?—ня гледзячы на ўсю далікатнасьць пецярбуржца, рэзка спытаўся Савіцкі.

Пецярбуржац зьдзіўлена аглядзеў Савіцкага і нібы не разумеючы яго дадаў:

— Я вельмі рад! Вельмі!..

— Я таксама вельмі рад,—перабіў пецярбуржца Савіцкі.—Што вам ад мяне трэба?

Дзіўная рэч! Ці то ад слоў Зіны, ці нешта падсьвядомае загаварыла ў Савіцкім, але неяк адразу яму не спадабаўся пецярбуржац.

— І гэты «франт» думае „узьдзець мяне на шыбеніцу",—падумаў Савіцкі і засьмяяўся сваім думкам...—Ах, ды што гэта мне ўсякае глупства лезе ў галаву. Паверыць словам нейкай інстытуткі і нізашто абразіць такога паважнага барацьбіта...

— З гэтым ня лёгка будзе! Упарты і асьцярожны. Але нічога, былі і ня такія!—думаў у сваю чаргу пецярбуржац. А ў голас сказаў:

— Я ехаў сюды з Пецярбургу амаль выключна дзеля таго, каб пабачыць вас і абгаварыць з вамі некаторыя справы, але я спадзяваўся, што нашая гутарка будзе больш ветлівая.

— Я вас слухаю!—усё яшчэ з варожасьцю сказаў Савіцкі.

— Так... так... вы слухаеце, але, здаецца, вы ня хочаце мяне слухаць... Тады нам самае лепшае і наогул не гаварыць болей!—таксама рэзка сказаў пецярбуржац.

І прыехаўшы пабачыць Савіцкага пачаў пражыгаць яго вачыма.

Ад адказу Савіцкага цяпер залежыла ўсё. І пецярбуржац на гэты раз зрабіў верны ход...

— Выбачайце, калі можа я ня ветліва вас спаткаў,—сказаў Савіцкі.—Але ў лясох я навучыўся быць непасрэдным у сваіх адчуваньнях.

— Значыць, вашыя адчуваньні дыктуюць вам неабходнасьць быць грубым?

— Кінем аб гэтым,—адказаў Савіцкі...—Калі я быў недалікатны да вас—прабачце... І, нібы прабачаючыся, Савіцкі дадаў:—Я памыліўся ў (■ і першым уражаньні, а папершаму уражаньню вы яшчэ не спадабаліся,—са ўсёю сваёй шчырасьцю адказаў Савіцкі.

Пецярбуржац засьмяяўся...

— Ведаеце,—сказаў ён,—нашая прафэсія накладае на кожнага з нас адбітак нейкай падазронасьці, і таму мне толькі і застаецца, што засьмяяцца ў адказ на вашую падазронасьць і сказаць вам, што ў вас яна разьвіта яшчэ ў большай меры, чым у тых, хто працуе ў больш небясьпечных умовах.

Савіцкі зразумеў гэты сказ, як намёк на тое, што пецярбуржцу даводзіцца працаваць у больш небясьпечных умовах...

Сапраўды, пасьля таго, як на зьмену пачуцьцям прышоў халодны аналітычны розум і лёгічныя разважаньні, Савіцкаму зрабілася соромна за сваю падазронасьць да гэтага загартованага ў барацьбе чалавека.

Каб канчаткова разьвеяць уражаньне ад сваіх слоў, Савіцкі сказаў:

— Я таксама хацеў пабачыцца з вамі... Дзеля гэтага я і зрабіў вёрст дзьвесьці на панскіх конях. Я быў рад спаткацца, але...

— Што але?..—ажывіўся пецярбуржац.

Але адна недарэчная гутарка па дарозе сапсавала мой настрой.

— Што гэта за гутарка?—пасуніўшы брыва спытаўся пецярбуржац.

— Так... Глупства. І Савіцкі нахістаў галавою, быццам жадаючы, каб вылецелі тыя непрыязныя думкі, што там былі. Глупства... Але калі хочаце, я вам скажу...

— Калі ўспаміны аб гэтай гутарцы ня вельмі сапсуюць ваш настрой, я з ахвотаю вас паслухаю.

— Не, нічога! не сапсуюць настрою, шчыра адказаў Савіцкі.—Проста мяне адзін чалавек папярэдзіў, каб я сьцярогся прыезджага з Пецярбургу, які, па словах таго чалавека, зьбіраецца ўзьдзець мяне на шыбеніцу.

Пецярбуржац застаўся спакойным. Ніводзін мускул не задрыжаў на яго твары.

Відаць, гэты чалавек, апрача нязвычайнай волі, меў яшчэ і вялікія здольнасьці актора, а усё гэта, бясспрэчна, давала яму перавагу над Савіцкім, які, апрача таксама нязвычайнай волі, меў надзвычайную беларускую здольнасьць быць шчырым.

— Дык, кажаце, вас папярэдзілі, аб тым, што едзе сюды пецярбуржац, які «ўзьвядзе вас на шыбеніцу?..» Цяпер я вас разумею...—спакойна засьмяяўся пецярбуржац... Я таксама прыехаў з Пецярбургу, гэта вельмі сур'ёзная прычына для таго, каб, пабачыўшы мяне, у вас, сапсаваўся настрой.

— Ды я й сам ведаю, што ўсё гэта глупства...

— Гэта падазроньне ніжэй усякай крытыкі,—сказаў пецярбуржац—і, лічачы гутарку скончанай, пецярбуржац загаварыў пра іншае.

— Я прыехаў сюды для арганізацыі ў Менску шэрагу тэрарыстычных актаў,—сказаў ён... Яшчэ ў Пецярбургу я меў на ўвазе пабачыцца з вамі і дагаварыцца аб дапамозе.

— Вы лічыце, што я магу вам дапамагчы?—запытаўся Савіцкі.

— Я ў гэтым упэўнены.

— Але я ніколі яшчэ не рабіў тэрарыстычных актаў ў самым Менску. Да гэтага часу пад маім наглядальнем былі маёнткі,—скромна зазначыў Савіцкі...—Але, калі гэта трэба, я справлю быць карысным і там... нібы баюся, каб яго не абвінавацілі ў трусасьці, дакончыў Савіцкі.

—Ну, вось гэта лепей! узрадаваўся пецярбуржац.—Нарэшце, мы знайшлі агульную мову. Значыць,—вы мне абяцалі дапамогу?—жыва запытаўся ён у Савіцкага.

— Абяцаю!

— Тады, давайце ўмовімся гэтак: я правяду ўсю падрыхтоўчую працу і прыблізна праз тыдзень буду чакаць вас у Менску... Адрас кватэры, дзе спакойна можна будзе супыніцца, я вам пакіну.

— Праз тыдзень я буду на тэй кватэры, адрас якой вы мне пакінеце,—шчыра згадзіўся Савіцкі.

І каб канчаткова згладзіць тую, як здавалася Савіцкаму, абразу, якую сваёю падазронасьцю ён міжвольна нанёс раней пецярбуржцу, Савіцкі сказаў

— Зараз я чакаю ад вас першага даручэньня, якое я павінен буду выканаць.

— Першы тэрарыстычны акт, які мы павінны будзем выканаць, гэта акт забойства жандарскага палкоўніка Стрычалава за яго дзікія абразы ў адносінах да палітычных...

— І гэта ўсё?—сумна ўсьміхнуўшыся, запытаўся Савіцкі...—Забойства жандарскага палкоўніка і ў гэтым увесь тэрор?

— Гэта будзе толькі першы наш крок...—адказаў пецярбуржац.

— Будзе зроблена!—даў згоду Савіцкі.

(Далей будзе).

*) Гл. „С. Б." № 202—219.

Ад лютага да Кастрычніка.

(Хроніка гістарычных падзей).

14—27 верасьня.

Адчыняецца „Всероссийское Демократическое Совещание", склад якога наступны: саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў—230 чал.; саветы сял. дэпутатаў—230; гарады—30; земствы і губ. вык. кам-ты—200; армейскія арганізацыі—83; камісары—22; казакі—35; армейскія і сял. сэкцыі—18, афіцэры 4, інваліды вайны—6, флёт—15, прафсаюзы—100, пашт.-тэлеграф. служач.—12, настаўнікі—15, т.-п. служачыя—30. цэнтр. каапэратывы—120, рабочыя каапэратывы—38, эканам. група—33, друк—1, харч. арганіз. і к-ты—20, саюз духавенства—1, сялянскі саюз—10, фольчары—5, украінская рада—15, мусульманскі савет—10, савет нац. сац. партый—10, яўрэі—1, палякі—2, грузінскі міжпартыйны саюз—5.

З поводу гэткага разьмеркаваньня прадстаўніцтва на «Совещании» «Раб. Путь» піша: „Як быццам дзеля таго, каб гэта нарада на была нарадай „адной клясы"... на не пацягнулі прадстаўнікоў каапэратываў, недэмакратызаваных земстваў і г. д. Прадстаўніцтва рабочай, салдацкай і сялянскай дэмакратыі „урэзали, извратили, окарнали"...

„Совещание" адчыніў Чхэідзе, які, характарызуючы тагочаснае становішча Рассеі, гаворыць, што «дзяржаўная ўлада аказалася амаль паралізаванай».

Керанскі ў сваім выступленьні ахарактарызаваў «карніляўшчыну», зазначыўшы пры гэтым, што „весткі аб падрыхтаваным і магчымым ваенным перавароце яму сталі вядомы задоўга да падзей" (у гэтым месцы яго прамовы нехта з партэра крыкнуў: «врагаварыўся!»).

Прадстаўнік бальшавіцкай партыі (Каменеў) рэзка крытыкуе ўсю палітыку час. ураду і падкрэсьлівае, што „карніляўшчына" ўзгадавалася над крылом час. ураду".

15—28 верасьня.

Пецярбурскі Камітэт РС-ДРП (бальшавікоў) выдаў адозву да рабочых і салдат Петраграду, з поводу скліканьня „демократического совещания", у якой заклікае ўзьняць рашучы пратэст супроць каліцыйнай улады, узьняць голас супроць паменшчыкаў, за зямлю сялянам, супроць фабрычкатаў і заводчыкаў, за рабочы кантроль, супроць імпэрыялістаў, за справядлівы дэмакратычны мір.

Адбываліся пасяджэньні дэлегацый на „демократическое совещание".

Фракцыя

З наступнага тыдню ў нашай газэце

РЭГУЛЯРНА

ў сераду **СТАРОНКА КРЫТЫКІ,**

у нядзелю **СТАРОНКА ЛІТАРАТУРЫ.**

У літаратурнай старонцы будуць зьмяшчацца лепшыя творы беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў і пераклады з твораў лепшых чужаземных пісьменьнікаў.

У старонцы крытыкі будуць зьмяшчацца артыкулы на актуальнейшыя тэмы сучаснага літаратурнага жыцьця і агляды навінак мастацкай літаратуры.

Чытайце „Савецкую Беларусь". Падпісвайцеся на „Савецкую Беларусь". Распаўсюджвайце „Савецкую Беларусь."

Вёска сёньня.

Сельска-гаспадарчы падатак.

Падатак здаюць да тэрміну.

Пры раздачы акладных лістоў па райёне праводзілася адначасова і растлумачэньне аб неабходнасьці і карысьці здачы падатку да тэрміну. У выніку гэтага, ужо з 7 верасьня сялянне пачалі здаваць падатак, хаця і незначнымі сумамі. Аднак з 18 па 21 верасьня паступіла у райкасу каля 1000 руб. Усяго здадзена па 22 верасьня 1927 г. 1479 руб. 64 к.

Здае падатак, галоўным чынам, середняцкая і бядняцкая частка сялянства. У большасьці выпадкаў падатак да 10 руб. здаецца поўнасьцю. Ёсьць выпадкі, калі сяляне здавалі грошы пры вучоце аб'ектаў абкладаньня.

— Палажэце ў касу ашчаднасьці, а як выпішуць ліст, заплаціце. Цяпер грошы ёсьць, а потым можа іх і ня будзе.

Заможная частка за малымі выключэньнямі чакае тэрміну. Скарг на падатак у гэтым годзе ў параўнаньні з мінулым значна менш. Сялянства чакала большага падатку чым ёсьць.

Я. Л.

Любанскі р., Бабруйшчына.

Багацеі чакаюць.

Нараканьняў на падатак з боку бяднейшых гаспадарак у гэтым годзе ня чутно.

Толькі больш заможныя гаспадары крычаць:

— Мы ня будзем за беднату плаціць, а калі і бядняк мае зямлю, дык няхай і ён такі падатак плаціць, як і мы, або няхай бедната адмовіцца ад зямлі і мы яе забяром.

Бачачы, што бедната бярэ верх над заможнымі, заможныя гаспадаркі, бамбардыруюць сельсаветы заявамі, што ім несправядліва зрабілі вучот аб'ектаў абкладаньня, або ў яго гаспадарцы штось здарылася і г. д. А ў гэты час бедната і сераднякі пачынаюць датэрмінова ўплачваць падатак поўнасьцю або за два тэрміны, кажучы:

— Трэба дапамагаць сваёй уладзе.

Неабходна с-с растлумачыць на агульных сходах, што скідак ніякіх ужо ня будзе, за выключэньнем стыхійных няшчасьцяў. А трэба раўняцца з уплатай падатку разам з беднатой і серадняками.

Малапісьменны.

Пятрыкоўскі р., Мазыршчына.

Сталі культурнымі гаспадарамі.

На прыгожым, высокім мейсцы ў Старым—Сяле, на ўзбярэжку рэчкі Птыч, раскінуўся пасёлак, названы ваколічнымі сялянамі «Батратчынай». Названы ён так таму, што жывуць у ім батракі ранейшага пана ў Старым Сяле—Валадковіча. Прыйшоў Кастрычнік, і батракі Валадковіча сталі самі вольнымі гаспадарамі. Праўда, зямельнага надзелу яны не атрымалі, бо на ўсёй зямлі ранейшага пана быў арганізаваны савхоз і батракам асталася толькі тая зямля, якую яны самавольна абсявалі, ня гледзячы на забарону савхозу. Але прышоў 1925 г. Па мейсцы савхозу, які к гэтаму часу ліквідаваўся, тут заснавалася дзіцячая калёнія (працуючая і зараз) і ўся зямля, належачая савхозу, была раздзелена. Адну частку атрымала дзіцячая калёнія, другую—сяляне вёсак Пільні і Закаблук і трэцюю—атрымалі батракі.

Надзел батракоў зямлёй быў зроблен вельмі ўдала: кожны з іх атрымаў сялібу на лепшай зямлі маёнтку, некалькі досыць **шырокіх** ніў, спрыяючых лепшай апрацоўцы зямлі. Батракі адразу-ж узяліся за працу. Атрымаўшы лесу, яны сталі будаваць неабходныя для першага часу будынкі. Прайшло яшчэ два гады, і вы зусім не пазнаеце ранейшых батракоў. Кожны з іх зараз мае новую хату, некаторыя пачалі садзіць ужо і сады. Сельсавет ім таксама дапамагае водпускам у патрэбнай колькасьці і ў першую чаргу будаўнічага матар'ялу—лесу. Батракі ў нас зараз і самыя культурныя гаспадары. Па палёх у іх у вялікай колькасьці растуць кармавыя травы і карняплоды, агароды ў іх таксама лепшыя, чымся ў, ваколічных сялян. Ды і наогул зараз іх зусім не пазнаць. Паступова, перамогшы ўсе цяжкасьці, яны вышлі на шырокі сьветлы шлях жыцьця. Савецкая ўлада ім добра дапамагла. Вось зачым панны батракі так чакаюць 10-й гадавіну Кастрычніка, рыхтуюцца к ёй і падаюць прыклад іншым сялянам.

Селянін. **А-сь Г-кі.**

В. Гаішча, Заслаўскага р., ґа Меншчыне.

Няма працы.

Вёска Піваны складаецца з 150 двароў. Ёсьць дзе распачаць працу. Раней, праўда, неяк былі выбраны дэлегаткі, а надалей зноў заціхла. Праца сярод іх не вялася. Па другіх вёсках працуюць яслі, бываюць сходы сялянак, а ў нас нічога няма.

За ўвесь час ніхто з жанаддзелу да нас не заглянуў. Цяпер трэба распачаць падрыхтоўку да Кастрычнікавай рэвалюцыі, а ў нас няма з кім, няма нават і дэлегатак.

Усебеларускаму зьезду работніц і сялянак трэба асабліва абгаварыць пытаньне працы сярод жанчын на мяйсцох.

Алесь Бытавы.

Старобінскі р., Бабруйшчына.

Нашы недахваты.

Есьць у Смалявіцкім райёне невялікая вёска Малое Залужжа. Расхінулася яна на беразе невялічкай балотнай рэчкі.

Перад рэвалюцыяй—цёмная забітая вёска, якая знаходзілася пад уладай пана і ўрадніка. Цяпер яна выглядае па іншаму. Паспрод вёскі ўзвышаецца вежа—гэта пажарная каланча. Дзякуючы РВК, вёска набыла машыну і ўжо раз адратавалася ад агульнага пажару, калі маланка запаліла будынкі двух гаспадароў.

Доўга мучыліся сяляне з-за адсутнасьці пасьвішча і сенажаці. Нарэшце, аб'ядналіся ў мэліярацыйнае т-ва, затрацілі ў 1925 годзе 600 пудоў жыта і асушылі 65 дзесяцін балота, па якім раней нельга было чалавеку прайсьці, а цяпер вольна коні і каровы ходзяць. Гэта было першае мэліярацыйнае т-ва ў Смалявіцкім райёне, з якога ўзялі прыклад іншыя. За такую працу т-ва атрымала ад савецкай улады багатую прэмію: 2 пружынныя бараны, 1 сартыроўку і 2 плугі. Але на гэтым праца таварыства і замёрла. Разрабляць і арапь балота не бяруцца, заклалі толькі паказальны вучастак каля паўдзесяціны і засеялі вікавай мешаніной.

Ураджай атрымаўся вельмі добры каля 300 пудоў з дзесяціны), але апрацаваць усё балота шкодзіць тое, што на чале т-ва сталіць людзі, зусім не аўтарытэтныя ў бядняцкай масе і думаючыя на гэтай справе пабудаваць свой дабрабыт, атрыманьнем пэнсіі пры выпадку распрацоўкі, як члены праўленьня. Трэба, як мага, пазбавіць да т-ву ад такіх кіраўнікоў, і праца наладзіцца.

Гэтыя-ж самыя асобы былі абраны для правядзеньня земляўпарадкаваньня. Вёска рвецца пазбавіцца ад цезапалосіцы і трохпалёўкі. Але плёдам падыход Гурскага—земляўпарадкальніка, які адрэзаў у запасны фонд 5 дзес. сялянскага лесу мясцовага значэньня, злачынныя адносіны ўпаўнаважаных праваліл справу.

Формы новай культурнай гаспадаркі глыбока пранікілі ў вёску. Баранюць увясну жыта, сеюць канюшыну, лубін, кораньплоды і патроху ўжываюць на ўгнаеньне торф і штучныя парашкі.

Ёсьць у вёсцы школа, але да 1923 году тулілася яна па прыватных хатах. Быў тут актыўны настаўнік, які ўзварушыў сялян пабудаваць новую школу. Сяляне езьдзілі за 28 вёрст за лесам і пабудавалі школу, накрылі, а скончыць яе ніяк ня могуць. Трэба Смалявіцкаму РВК дапамагчы сялянству грашыма. Ліквідацыя няпісьменнасьці вядзецца пасьпетна і цяпер ужо няпісьменнымі засталіся 3 старыя кабеты.

Селькор.

Смалявіцкі райён, Меншчына.

У САВЕЦЕ НАР. КАМІСАРАЎ БССР

(Распарадчае пасяджэньне 24 верасьня 1927 г.).

АБ ФІНАНСАВАНЬНІ ГОМЕЛЬСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ.

Прымаючы пад увагу цяжкае фінансавае становішча Гомельскай электрычнай станцыі, якая не атрымала поўнасьцю намечаных на дзяржаўным бюджэце на 1926-27 г. для яе крэдытаў, Савет Народных Камісараў даручыў НК Фінансаў выдаць гарантыйны ліст ў бягучым бюджэтным годзе для атрыманьня ў Гомельскім рабочым банку 60 тыс. руб. для Гомельскай электрычнай станцыі за рахунак асигнаваньняў на электрыфікацыю на бюджэце 1927-28 г.

ЗАЧЫНЕНЬНЕ АДДЗЯЛЕНЬНЯ КАМУНАЛЬНАГА БАНКУ Ў БАБРУЙСКУ.

У мэтах рацыяналізацыі і патаньненьня банкаўскага апарату, Савет Народных Камісараў пастанавіў зачыніць у Бабруйску аддзяленьне Камунальнага Банку.

АБ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫХ РАБОТАХ У ГАЛІНЕ АХОВЫ ПРАЦЫ.

У зьвязку з тым, што псыха-тэхнічная лябараторыя, якая знаходзіцца ў веданьні Інстытуту Беларускай Культуры, аспоўную сваю работу праводзіць у галіне аховы працы, Савет Народных Камісараў прызнаў неабходным перадачу яе ў веданьне НК Працы.

Для якаснага палепшаньня работы псыха-тэхнічнай лябараторыі прызнана неабходным, каб работа яе праходзіла ў цеснай сувязі з адпаведнай катэдрай БДУ, пры чым работа ў лябараторыі ў той жа час павінна зьяўляцца практычным грунтам для работ катэдры.

Паколькі пытаньне аб арганізацыі Інстытуту аховы працы пакінута адчыненым, прызнана неабходным, каб работа арганізаванай у 1926-27 годзе (НК Працы супольна з Галоўсацстрахам) лябараторыі прамысловай санітарыі праводзілася разам з работаю псыха-тэхнічнай лябараторыі і клінікай прафесыянальных хвароб, без асобных асигнаваньняў на бюджэце.

Звыш таго, на выдаткі псыха-тэхнічнай лябараторыі вызначаецца 7,5 т. р.

АБ СЛУЦКІМ АДДЗЯЛЕНЬНІ ДЗЯРЖАЎНАГА БАНКУ.

У зьвязку з ліквідацыяй Слуцкай акругі, далейшае існаваньне ў Слуцку агенцтва Дзяржаўнага Банку зьявілася неадпавядным, і Эканамічная Нарада пастанавіла зьліквідаваць гэта агенцтва.

Савет Народных Камісараў, бяручы пад увагу неабходнасьць належнага правядзеньня хлебазагатоўчай кампаніі бягучага году, знайшоў магчымым пакінуць Слуцкае агенцтва Дзяржаўнага Банку да скончэньня хлебазагатоўчай кампаніі і разам з гэтым даручыў НК Фінансаў распрацаваць пытаньне аб далейшым крэдытаваньні раёну пасьля ліквідацыі ў Слуцку агенцтва Дзяржаўнага Банку.

Праца праэктнага бюро ВСНГБ.

Разгледжаны праэкты шэрагу новых фабрык і заводаў.

СТАНДАРТНАЕ БУДАЎНІЦТВА ДАМОЎ.

Праэктнае бюро пры ВСНГБ арганізавалася нядаўна. Бюро арганізавана дзеля таго, каб праэкты новых фабрык, заводаў і інш., якія дасюль адсылаліся на разгляд у Маскву, разглядаліся на месцы. У склад бюро ўваходзяць інжэнэры, якім добра вядомы мясцовыя ўмовы, і складаньне розных праэктаў праз гэтае бюро будзе найбольш карысным.

Бюро разьмеркавала сваю працу па сэкцыях: архітэктурна - будаўнічай, электра-мэханічнай і тэхналёгічнай. Кожная сэкцыя мае свайго экспэртаспэцыяліста, які дае заключэньні па разгледжаных праэктах.

Бюро ўжо разгледзіла шэраг праэктаў, важнейшыя з якіх паступаюць: **склад для кансэрваваньня і захаваньня скуранога сырцу, склад будзе пабудован на Ляхаўцы, недалёка ад гарбарняў. Агульная плошча, якую будзе займаць гэты склад, перавышае 3.200 квадратных мэтраў. На пабудову складу па каштарысе вызначана 116.000 руб.**; кастамольны завод, які мае будавацца на адной з вузлавых чыгуначных станцый БССР; мылаварны завод; на чарзе стаіць разгляд праэкту фабрыкі «Вітшвэю» на 800 чалавек рабочых і інш.

Інжэнэры праэктнага бюро арганізавалі кансультацыю для прадстаўнікоў з акругаў. Будуць давацца парады на ўсіх галінах будаўніцтва.

Бюро прыступіла да распрацоўкі праэктаў стандартнага будаўніцтва дамоў як драўляных, так і бэтонных. Такія дамы дадуць магчымасьць патаньніць і прысьпешыць кватэрнае будаўніцтва. **Пабудова аднаго дома, у сярэднім ад 4 да 7 пакоікаў, будзе каштаваць прыблізна 3.000—3.500 руб.**

Складка стандартных дамоў будзе цягнуцца ня больш 2-3 тыдняў. Кожны пакой будзе мець асобны ўход знадворку, чым дасягаецца выгода ў здачы пакояў кватарантам.

Апроч гэтых мерапрыёмстваў, бюро вызначыла яшчэ цэлы шэраг крокаў да прысьпяшэньня кватэрнага будаўніцтва.

С. А.

ХРОНІКА.

Калі адбудзецца малочная выстаўка.

Праўленьне Белсельсаюзу пастанавіла прыстасаваць адчыненьне ўсебеларускай малочнай выстаўкі да дзён сьвяткаваньня Кастрычнікавага юбілею.

Акруговыя нарады працаўнікоў с.-гасп. каапэрацыі.

Па ўсіх акругах Белсельсаюз праводзіць акруговыя нарады старшынь сельска-гаспадарчых таварыстваў і малочных арцеляў. Мэта нарадаў—вызначыць шляхі далейшай працы.

Крэдыт на земляўпарадкаваньне яўрэяў.

Белсельбанк дадаткова разасыгнаваў па акругах Беларусі 53.000 руб. на земляўпарадкаваньне працоўных яўрэяў.

Беларуская прадукцыя—на Саюзны рынак.

Белпайгандаль на Ніжгародзкім кірмашы зрабіў умову з цэнтральнымі каапэратыўнымі арганізацыямі па дастаўку непасрэдна з беларускіх заводаў: ільнянага масла на 85.000 руб., абояў—на 118.000 руб. і паперы—на 115.000 руб.

Забясьпечаньне БССР цукрам.

У 1926-27 г. на ўсёй Беларусі было прадана 1240 вагонаў цукру. У 1927-28 г. намечана да продажу 1400 вагонаў цукру.

У 1-м квартале 1927-28 г. намечана завезьці 320 вагонаў цукру. Беларускі рынак будзе поўнасьцю забясьпечан цукрам.

Абсьледваньне працы ОСО-Авіяхіму на мясцох.

Цэнтральны савет ОСО-Авіяхіму Беларусі на днях закончыў абсьледваньне акруговых і некаторых райённых саветаў і па 2-3 гарадзкія ячэйкі. Абсьледваньне выявіла становішча і працу акруговых саветаў ОСО-Авіяхіму.

Мопр.

— Перавыбары бюро ячэек МОПР'у у Гомельскай і Віцебскай акругах распачаліся з 15 верасьня. У астатніх акругах перавыбары пачнуцца з 1 кастрычніка і будуць закончаны да 1 сьнежня.

— 8-9 кастрычніка адбудзецца пленум Менскага акруговага камітэту МОПР'у. Па павесцы дню стаць справаздачы акруговага і 4 райённых камітэтаў МОПР'у, заданьні на васеньня-зімовы пэрыад і аб падрыхтоўцы да сьвята Кастрычніка.

ЗДАРЭНЬНІ.

ТРАГЭДЫЯ Ў В. СКВАРЦОХ.

Захар Шчасьлёнак з в. Скварцы, Койданоўскага райёну, пасварыўся з пасынкам і яго жонкай. У сварцы ён забіў пасынка сякерай і параніў яго жонку Галену.

„КАВАЛІ".

Раскрыты кражы, зробленыя ў дзьвёх кузьнях на Маскоўскай № 25 і ў Рыгораўскім завулку № 9. Злодзеі затрыманы. Рэчы зьвернуты пацярпеўшым.

ЗГАРЭЎ ГРАМАДЗКІ СЬВІРАН.

Згарэў сьвіран, які знаходзіўся пры Заслаўскім РВК. У сьвірні было сялянскае збожжа. Страты—1.200 руб.

У ЦК БЕЛАРУСКАГА ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ.

АТРЫМАНЬНЕ СТРАХАВОЙ ПРЭМІІ З АМЭРЫКІ.

У часе імпэрыялістычнай вайны шмат рускіх эмігрантаў уступілі ў амэрыканскую армію, якія пры паступленьні застрахавалі сваё жыцьцё ў карысьць сваякоў у сярэднім на 10 тыс. даляраў. У сучасны момант Беларускае т-ва Чырвонага Крыжу разьсылае асоб, якія мелі сваякоў у амэрыканскай арміі, і дапамагае ім праз свайго амэрыканскага прадстаўніка атрымліваць гэтую страхавую прэмію. Беларускае т-ва Чырвонага Крыжу ўжо разьслала ка 30 такіх асоб, якім ужо афармлены адпаведныя дакументы. Некаторыя з іх у бліжэйшы час атрымаюць страхавую прэмію.

Апошні тэрмін прадстаўленьня гэткіх прэтэнзій у Амэрыку канчаецца 1-га студзеня 1928 г.

УТВАРЭНЬНЕ АРГАНІЗАЦЫІ ЧЫРВ. КРЫЖУ НА ТРАНСПАРЦЕ.

ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу рашыў арганізаваць на чыгунках ячэйкі і дарожныя камітэты Чырвонага Крыжу. Гэткія ячэйкі ўжо арганізаваны на Менскім вузле, а таксама на Гомельскім і Бабруйскім вучастках чыгункі. Галоўныя абвязкі гэтых ячэек і камітэтаў—ваенізацыя чыгуначнікаў у санітарнай галіне.

УЗГАДНЕНЬНЕ АБАВЯЗКАЎ ПАМІЖ БЕЛАРУСКІМ ОСО-АВІЯХІМАМ І Т-ВАМ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ.

Паміж ЦС ОСО-Авіяхіму і Беларускім т-вам Чырвонага Крыжу выпрацавана згода, водгук якой Беларускае т-ва Чырвонага Крыжу бярэ на сябе ўсю працу па санітарнай ваенізацыі насельніцтва, а таксама абавязкі на падрыхтоўцы санітарных камандаў, якія знаходзяцца ў складзе авіяхімаатрадаў і інш. баявых груп ОСО-Авіяхіму. Акрамя гэтага, беларускае т-ва Чырвонага Крыжу будзе дастаўляць авіяхімаатрадам медыка-санітарную маемасьць.

УДЗЕЛ ВА ЎСЯСЬВЕТНАЙ ВЫСТАЎЦЫ.

ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу пастанавіў прыняць удзел ва ўсясьветнай выстаўцы, якая арганізуецца саюзам культурнай сувязі з заграніцай. Зараз т-ва вядзе працу па падрыхтоўцы экспанатаў.

АРГАНІЗАЦЫЯ КАМІСІІ ЗАГРАНІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ.

Пры ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу складзена камісія заграничнай інфармацыі. Мэта гэтай камісіі інфармаваць праз заграничны друк становішча бяспрытульнасьці і дапамогі дзецям, якая аказваецца савецкай грамадзкасьцю.

ЖЕНЩИНЫ, ХОЗЯЙКИ! МАТЕРИ, КУСТАРКИ!

СПЕШИТЕ ПОДПИСАТЬСЯ

на ежемесячный домашне - хозяйственный богато-иллюстрированный и модный

„ЖЕНСКИЙ ЖУРНАЛ"

К каждому номеру прилагаются выкройки и контурные листы.

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ:

„ЖЕНСКИЙ ЖУРНАЛ" на 6 мес.—5 р. 50 к., на 3 мес.—3 руб.

„ЖЕНСКИЙ ЖУРНАЛ" с приложением „КУЛИНАРНОЙ КНИГИ" на 6 мес.—6 р. 30 к., на 3 мес.—3 р. 80 к.

Полугодовые подписчики получат, кроме того, БЕСПЛАТНУЮ ПРЕМИЮ: 10 книжек „БИБЛИОТЕКИ ОГОНЕК".

Переводы адресовать: МОСКВА 9, Тверской бульвар 26.

АКЦ. ИЗДАТ. О-ВУ „ОГОНЕК".

Подписка принимается также во всех почтовых учреждениях СССР.

Згублены.

— Сяброўскі білет № 4296, выд саюзам працасьветы, 2) Пасьведчаньне, выд. Койданаўскай сямігодкай на імя Лотвіц В. М, кв. № 4052.

— Дапрызыўная кніжка Мыскіна А. А.,—выд. Менакрваенкма нарадж, 1906 г. кв. 4053.

— Вучотна-пайскав. білет № 36 Лалабава Е. А.—выд. Рэчыцкім камісарыятам у 1926 г., кв. 4054.

— Талёны за №№ 30-034 на 13 руб. 30831 на 13 р., выд. Рудзенскім Жамжомам для атрыманьня грошай на імя Міхалковіча Сьцепана і Мікалая, кв. 4055.

— Кадэтэрап. кніжка Лосік Е. Л.—выд. МЦРК, кв. 4056.

— Кніжка Мопра Кажарскага І. К, выд. Выканбюро БДУ, кв. 4057.

— Кніжка Кажарскага І. К. Праф Напісьменасьці, выданая Выканбюро БДУ кв. 4058.

— Службовае пасьведчаньне № 185, Федоткам М. М. выд. Пленчаніцкім спажыв. таварыства кв. 4068.

С У Д.

НЯПРОШАНЫ ГОСЬЦЬ.

Пасьля зарэгістраваньня дзіяці ў сельсавеце Тодар Маскалёў пакікаў суседняў на пачэстку. На „крысьціны" Маскалёў заклікаў і свайго кума Гарасіма Ціхінскага.

Было позна. Амаль усе ўжо ў вёсцы Вараніла спалі. Сафон Амяльянаў пахаджаў па вуліцы і глытаў сьлінку.

— Хочацца піць і годзе. Хоць ты тут ствары гарэлку, а выпіць дай.

Калі Амяльянаў праходзіў побач хаты Маскалёва і праз вакно бачыў, як там перахілялі шклянку, яму яшчэ мацней захацелася выпіць. Урэшце, ён ня вытрываў: пастукаў у дзьверы і папрасіў у гаспадара выпіць. Гаспадар у хату ўпусьціў, але выпіць ня даў.

Злосьць разабрала Сафона Амяльянава. Ён адклікаў у бок Гарасіма Ціхінскага і кажа:

— Каб гэта ты, браток, пастараўся чарачку... Вельмі, ведаеш, выпіць хочацца.

— Нялоўка, бачыш. Як я буду распараджацца гарэлкаю гаспадара? Нялоўка. Лепей папрасі ў Тодара.

— А можа ты яму скажаш, каб даў, значыцца, перахіліць...

— Не, браток, лепей ты сам...

Гутарка Амяльянава і Ціхінскага намалу перайшла ў спрочку. Ціхінскі быў ужо пад хмяльком, і ў яго хапіла храбрасьці стукнуць Амяльянава ў вуха. Апошні ў даўгу не застаўся і некалькі раз ударыў Ціхінскага. Агульнымі сіламі госьці іх разьвялі.

Пасьля гэтага Амяльянаў нашоў нібы дамоў, а госьці—спаць. Ціхінскаму ня спалася, ён пашоў да хаты. Каля чыгуначнай лініі яго чакаў Амяльянаў з калом. Абраза для апошняга з боку Ціхінскага была „вялікая": ён ня толькі ня даў выпіць, а яшчэ ўдарыў яго. Амяльянаў рашыў адамсьціць яму за абразу.

Дачакаўшыся Ціхінскага, Амяльянаў выскачыў з рова і два разы ўдарыў апошняга па галаве. Раны былі настолькі сур'ёзныя, што Ціхінскі на другі дзень памёр.

Выязная сэсія Аршанскага акруговага суду ў г. Клімавічах прыгаварыла Амяльянава на 6 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

Вярхоўны суд пакінуў гэты прыгавар у моцы, а касацыйную скаргу Амяльянава без вынікаў.

С. Азерскі.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Розыгрыш васеньняга першынства па футболе.

У панядзелак, 26 верасьня на пляцоўцы „Прафінтэрн" адбыўся футбольны матч паміж камандамі БДУ і камандай саюзу сав. працаўнікоў, які скончыўся з вынікам 2:1 на карысьць каманды БДУ.

Футбольны матч Барысаў—Плешчаніцы.

У Барысаве адбыўся футбольны матч паміж Барысаўскай зборнай камандай і камандай Плешчаніц (№ пагранатрад), які скончыўся з вынікамі 19:5 на карысьць барысаўцаў. Вельмі некарэктна вялі сябе ў час гульні спартсмэны Плешчаніц, дапушчаючы грубыя выхадкі.

Арганізацыя фэхтаваньня і стралковай сэкцыі.

Пры асацыяцыі прапаўнікаў фізкультуры ў зьвязку з ваенізацыяй ф.к. арганізаваны фэхтавальная і стралковая сэкцыі, якія ўжо распачалі працу.

Апавяшчэньне.

— Сёньня, 28 верасьня, а 6 гадз. увечары ў малай залі клюбу К. Маркса адбудзецца пашыранае пасяджэньне калегіі АПА Менакругкому КП(б)Б, разам з апоргамі ячэек КП(б)Б гор. Менску.

ПАВЕСТКА ДНЯ:

1. Даклады Гарадзкога, Акцябрскага і Ляхаўскага РК і Барысаўскага ГК аб масавай працы пад вуглом выкананьня дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б.

2. Даклад Культаддзелу ЦСПСБ аб масавай працы на прадпрыёмствах пад вуглом выкананьня дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б.

3. Інфармацыя аб кампаніі па распаўсюджаньні пазыкі індустрыялізацыі.

Яўка членаў калегіі і апоргаў ячэек КП(б)Б г. Менску абавязкова.

Рознае.

РАДЫЁ-ТЭЛЕГРАФНЫ РЭКОРД.

Выключную па результатах працу праробілі 5 радыё-тэлеграфістаў, што несьлі службу на судне „Мэмфіс", на якім палкоўнік Ліндберг вяртаўся з Эўропы ў Амэрыку. Праз цэлы час падарожжа яны прымалі тэлеграмы з прывітаньнямі са ўсіх краін сьвету і пасылалі абшырныя камунікаты спэцыяльнага карэспандэнта Нью-Ёрскага «Таймса». У працягу 5 дзён праз адну гэту радыёстанцыю прайшло каля 75.000 слоў—рэкорд, які ня так скора будзе пабіты.

РАСПАЎСЮДЖАНЬНЕ РАКА СЯРОД НАРОДАЎ ЭЎРОПЫ.

Жэнеўскі праф. Піттард улажыў антропалёгічную мапу Эўропы, адзначаючы на ёй, якія разьмеры мае хвароба рака сярод наасобных клясаў і народаў Эўропы. Аказваецца, што гэта страшная хвароба распаўсюджана найбольш сярод так званых „лоўгаловых", якія жывуць на поўначы Эўропы. Затое сярэдня-морскія і адрыятычныя народы, якія належаць да „круглагаловых", выказваюць куды большую адпорнасьць арганізму да падобных хваробаў.

БОКС.

22 верасьня г.г. у Чыкага адбыўся боксэрскі турнір паміж Дэмпсэем і Тэнэем,—двума чэмпіёнамі сьвету. У мінулым годзе Тэнэй перамог Дэмпсэя, але Дэмпсэй лічыў, што ён пераможан выпадкова. І вось яны яшчэ раз сайшліся ціпер, каб вырашыць, хто з іх чэмпіён. На гэты чэмпіянат зьехалася са ўсёй Амэрыкі 100.000 чалавек. На чэмпіянаце было 150.000 прысутных. Білетаў было прададзена на 2.500.000 даляраў.

І на гэты раз Тэнэй перамог Дэмпсэя на заканчэньні 10-га ронду.

ЛОЎЛЯ ГАЗАМІ АРАНГУТАНАЎ.

Нямецкі праф. Гэк, зоолёг, знайшоў новы спосаб лавіць жывёл арангутанаў, патрабных у нанукових медычных справах. Для гэтага ён ужывае адуральныя газы. Апэрацыя гэта саўсім лёгкая для палявічых і ня шкодзіць здароўю арангутанаў. Раней іх лавілі і замыкалі ў клетку ў такім стане, што змучаныя і расхваляваныя жывёліны гінулі ў значным ліку.

ПАЛЁТ НА ПЕРАВЕРНУТЫМ АПАРАЦЕ.

Лётнік Фізідер выканаў гэтымі днямі арыгінальны палёт: ён ляцеў у працягу 15 мінут з Кёльну да Боону на апараце, перавернутым дагары калёсамі. Спусьціўшыся ў Боонс, лётнік толькі праз нейкі час вярнуў сілы, якія пакінулі было яго, дзякуючы нязвычайнаму лёту.

ПАСТАНОВЫ і ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб аплаце звышмерных работ у дзяржаўных, грамадзкіх і каапэрацыйных установах і прадпрыёмствах.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Рабочыя і служачыя дзяржаўных, грамадзкіх і каапэрацыйных устаноў і прадпрыёмстваў маюць права на атрыманьне платы за звышмерныя работы, якія вялся імі па загадзе наймальніка, альбо з яго ведама, незалежна ад таго, ці быў наймальнікам атрыман адпаведны дазвол ад Інспэкцыі Працы.

2. Асобы, якія атрымоўваюць заработную плату па тарыфе адказных работнікаў альбо пэрсанальныя аклады, а таксама тыя, для якіх ненармаваны рабочы дзень устаноўлен калектыўным дагаворам, права на атрыманьне платы за звышмерныя работы ня маюць.

3. Забараняецца назначаць рабочым і служачым з нармаваным рабочым днём замест аплаты звышмернай работы набаўку да асноўнага акладу заработнае платы.

Наймальнік, які парушае правілы прадугледжаныя ў гэтым артыкуле, прыцягваецца да адказнасьці паводле арт. 132 Крымінальнага Кодэксу, а рабочы ці служачы, які атрымаў набаўку, мае права на розьніцу паміж гэтай набаўкай і належачай яму платай за звышмерную работу.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Пам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

15 верасьня 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Ц.И.К. и С.Н.К. БССР.

об уплате сверхурочных работ в государственных, общественных и кооперативных учреждениях и предприятиях.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР ПОСТАНОВЛЯЮТ:

1. Рабочие и служащие государственных, общественных и кооперативных учреждений и предприятий имеют право на получение вознаграждения за сверхурочные работы, которые велись ими по распоряжению нанимателя или с его ведома, независимо от того, было ли нанимателем получено соответствующее разрешение от Инспекции Труда.

2. Лица, получающие заработную плату по тарифу ответственных работников или персональные оклады, а также те, для которых ненормированный рабочий день установлен коллективным договором, права на получение вознаграждения за сверхурочные работы не имеют.

3. Запрещается назначать рабочим и служащим с нормированным рабочим днем вместо оплаты сверхурочной работы надбавку к основному окладу заработной платы.

Наниматель, нарушающий правила, предусмотренные настоящей статьей, привлекается к ответственности по ст. 132 Уголовного Кодекса, а рабочий или служащий, получивший надбавку, имеет право на разницу между этой надбавкой и причитающимся ему вознаграждением за сверхурочную работу.

Председатель Ц.И.К. БССР **А. Черезков.**
Зам. Предс. С.Н.К. БССР **М. Карклин.**
Секретарь Ц.И.К БССР **А. Хацкевич.**
15 сентября 1927 г.
г. Минск.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ТЭАТР-КІНО «КУЛЬТУРА».	3 аўторка, 27 верасьня. грандыёзны мастацкі баявік — „ПАЭТА І ЦАР" —
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	3 аўторка, 27 верасьня, ГІСТАРЫЧНАЯ ПАСТАНОЎКА „ЗАГОВОРЩИК МАДСАЛЮНА", у 6-х част. Звыш праграмы - гастролі ілюзіяніста А. М. Парчынскага і выступл. артыст. тэатру «Кривое Зеркало» Ф. М. Палуянава.
КІНО ПРАЛЕТАРЫ.	3 аўторка, 27 верасьня, бытавая фільма з жыцьця рыбакоў „СВЕЖИЙ ВЕТЕР", у 6-х частках. Звыш праграмы - грандыёзн. кіно-хрон. «Совкино» № 92.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 28

Менскага Гарадзкога Савету

26 верасьня 1927 г.

На зьмену абавязковых пастаноў сваіх ад 18 лютага г. г. за № 7 і 30 красавіка г. г. за № 20, Гарадзкі Савет **пастанаўляе:**

Устанавіць ніжэй вызначаны парадак правядзеньня працы і гандлю ва ўсіх дзяржаўных, каапэрацыйных і прыватных прамысловых, гандлёвых і саматужных прадпрыёмствах гор. Менску:

1. Гандаль прадуктамі харчаваньня праводзіцца з 8 г. 30 м. да 18 гадз. 30 м. з перарывам на абед з 13 да 15 гадз.

Увага: 1. Гандаль мясам, рыбай і гароднінай праводзіцца з 8 да 16 гадз. без перарыву на абед.

Увага: 2. Гандаль малаком і малочнымі прадуктамі, хлебнымі і булачнымі вырабамі праводзіцца з 8 г. да 18 г. з перарывам на абед з 13 да 15 гадз.

2. Гандаль выключна прамтаварамі (мануфактурай, абуткам, галянтарэяй, начыньнем і г. д.), а таксама сьпіртнымі напіткамі і віном на вынас праводзіцца з 10 да 20 гадз. з перарывам на абед з 13 да 15 гадз., а гандаль сьпіртнымі напіткамі і віном (апроч піва) расьпівачна і на вынас напярэдадні перабочых і сьвяточных дзён праводзіцца да 14 гадз. без перарыву на абед, а ў перабочыя дні і ў сьвяты зусім не праводзіцца.

3. У мэтах абслугоўваньня насяленьня ў часе перарыву на абед і ў вячэрнія гадзіны, Адміністрацыйны Аддзел Акруговага Выканаўчага Камітэту, пасьля ўзгадненьня з Аддзелам Працы, можа дазволіць частцы магазынаў гандаль у часе перарыву на абед і ў вячэрнія гадзіны, але не пазьней 24 гадз. ночы.

4. Гандаль выключна тытуневымі вырабамі, марожаным, газаванымі водамі і фруктамі са столікаў, латкоў,